ГЕРОЛЬД LITHERLAND

№ 3–4 (15–16). Горадня, 2004. Год IV.

“*Герольд Litherland*”© – навуковы геральдычны часопіс. Заснаваны ў 2001 г. Выдавец і рэдактар – Аляксей Шаланда. Рэдакцыйная рада: Сяргей Амелька (Горадня), Віталь Карнялюк (Горадня), Генадзь Семянчук (Горадня). Часопіс выходзіць раз у квартал і распаўсюджваецца толькі па замове. Наклад 100 асобнікаў. Пры перадруку спасылка на часопіс “*Герольд Litherland*” абавязковая. Адрас для допісаў і замоваў: **РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ, 230024, ГОРАДНЯ–24, п/с 50. E-mail: Litherland@tut.by**

ЗМЕСТ:

АРТЫКУЛЫ: А.Цітоў: **Гарадзенскія злотнікі ў XVI–XIX ст.**, с.69; А.Шпунт: **“*Клерыкальныя*” беларускія гарадскія гербы ад Станіслава Аўгуста Панятоўскага**, с.72; Я.Лялевіч: **Фармаваньне тэрыторыі Гарадзенскага павета ў XIV–XVI ст.**, с.76; Н.Сліж: **Лёс шляхцянак у вайне 1654–1667 г.**, с.85; А.Шаланда: **Сапраўдны гербоўнік шляхты Ваўкавыскага павета ў другой палове XVI–XVIII ст. (Б)**, с.90; **ПАВЕДАМЛЕННІ**: Ю.Гардзееў: **З гісторыі канцылярыі гарадзенскага магістрата XVI–XVIII ст.**, с.103; С.Амелька: **Радаводы шляхты Лідскага павета: Тальмонты**, с.109; С.Данскіх: **Вытокі шляхты ВКЛ: землеўладальнікі беларускага Панямоння паводле “*Die Littauischen Wegeberichte*”**, с.110; А.Шаланда: **Шляхта нямецкага паходжання і яе гербы ў Гарадзенскім павеце ВКЛ у другой палове XVI–XVIII ст.**, с.112; **КРЫНІЦЫ**: А.Шаланда: **Прывілеі XVI ст. для баяраў Краснікаў з Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве**, с.120; **РЭЦЭНЗІІ**, с.123; **ПЫТАННІ, АДКАЗЫ, КАНТАКТЫ, ІНФАРМАЦЫЯ,** с.135; **СПІС СКАРОТАЎ**, с.136.

АРТЫКУЛЫ.

Гарадзенскія злотнікі ў XVI–XIX ст.

In article “*The Horadnia gold businesses of the foreman at 16th–19th c.*” **Anatol Citoŭ** considers history of jeweller craft in Horadnia region, beginning from first mentions in sources of gold businesses of the foremen in 16th c., including existence of shop organization in Horadnia at 17th–18th c., up to end 19th c. In end is applied list of the Horadnia jewellers at 16th–19th c.

Прадстаўнікі гэтае прафесіі жылі ў месце з глыбокай старажытнасці. На першую палову XVI ст., па дакументальных крыніцах і апублікаваных матарыялах, фіксуюцца тры злотнікі, ў другой палове – два. У часы фундацыі ў Горадні цэху, хоць нам вядома, толькі некалькі імёнаў рамеснікаў, магчыма меркаваць, што тут сфарміравалася пэўная група спецыялістаў, што дазволіла ім прэтэндаваць на ўтварэнне злотніцкага брацтва. У годзе 1637 верасня 12 дня была зроблена “*актыкацыя*” статута мескімі ўладамі (адпаведна з прывілеям свой галоўны алтар злотнікі мелі ў Гарадзенскім Фарным касцёле) і, літаральна, праз некалькі месяцаў – году 1637 снежня 10 дня – адбылося зацьвярджэнне статута каралём Уладзіславам IV. Дзеля параўнання можна адзначыць, што магілёўскія злотнікі, у 1629 г. “*заактыкавалі*” свой статут на мескай ратушы, атрымалі каралеўскі прывілей і зацьвярджэнне свайго статута толькі праз пяць гадоў!

Канфірмацыя статута адбылася па прашэнню бурмістра злотніка Станіслава Цвікліча ў годзе 1650 месяцы сакавіку 20 дня [1, спр.123, а.299]. Найбольш калярытнымі ў асяроддзі гарадзенскіх злотнікаў нам уяўляюцца браты Станіслаў і Ян Цвіклі (Цвіклічы). Яны займалі ключавыя пазіцыі – старэйшых як у цэху, так і ў мескім магістраце, калі абіраліся на пасады

радцаў і бурмістраў, а Станіслаў быў нават абраны лянтвойтам (1634 г.) і, магчыма, ягоны сын. Станіславаў брат – Ян у 1671 г. адпаведна з тэстаментам свайго пляменніка Казімера Цвікліча, лянтвойта гарадзенскага, атрымаў "*кунтуш лазаравы, шапку з выдры і пенендзы*". У канцы XVII ст. іхні родзіч Войцех Цвікля быў прызначаны пажыццёвым старостай гарадзенскіх рыбакоў.

За перыяд XVI–XVIII ст. па няпоўных дакументальных дадзеных у месце налічвалася 12 чалавек злотнікаў. Змена ўлады ў канцы XVIII ст. і атрыманне местам статуса губернскага цэнтру, не магло не паспрыяць далейшаму развіццю гэтага рамяства. Па нашых няпоўных дадзеных усяго ў Гарадзенскай губерні на працягу XIX ст. налічваецца звыш 39 чалавек, сярод якіх юдзеяў – 19, хрысціянаў – 6, не вызначанай рэлігійнай прыналежнасці – 5 чалавек, не выключана, што агульная лічба злотнікаў у гэтай губерні магла дасягаць сотні.

Паводле статыстычных матэрыялаў, што захаваліся ў архівах, на працягу XIX–пачатку XX ст. на тэрыторыі губерні дзейнічала звыш сотні прадстаўнікоў гэтае прафесіі. У самой Горадні, паводле статыстыкі, рамеснікаў, занятых злотніцтвам і рэзаннем пячатак, было звыш 30 чалавек.

Па захаваных звестках, проберныя ўрады дзейнічалі ў месце з пачатку па-за мінулага стагоддзя. У 1821–1828 г. гарадзенскую Проберную Палату ўзначальваў Іван Міхаэліс. Пэўныя змены надзорных урадаў адбыліся ў 60-х г. таго ж стагоддзя. Як сведчаць дакументы ў месце ў 1835 г. было чатыры ювеліры, а ў 1839 – дзевяць.

У красавіку 1862 г. у дакументах як проберны майстра згадваецца Лаўрын Балабанаў. Ён, мусіць, займаў гэтую пасаду з 1851 г. У маі на пасаду пробернага майстры прэтэндуе былы тутэйшы злотнік – Ф.П.Вянглеўскі, які звярнуўся 10 мая 1862 г. у Казённую палату з прашэннем прызначыць яго на пасаду пробера. Гэтае хадайніцтва не было задавольнена: у архіўных крыніцах ужо ў чэрвені 1862 г. (да 1873) называецца "*выконваючым пасаду*" пробера В.Зімін. Пасля ўступу на пасаду, В.Зімін разгарнуў бурную дзейнасць. Пад час, калі ён займаў згаданую пасаду, (ва ўсялякім выпадку ў першыя гады) адбывалася штогадовая змена проберскіх клейнаў з ягонымі ініцыяламі **В.З** і датамі 1862, 1863 … г., а таксама з тымі ж лічбамі і літарамі, або без іх, але з гербам Горадні. У часы яго проберства былі асобныя авальныя клейны з літарамі П. і перавернутае Ш. з адпаведнымі пробамі (94, 91, 88, 84, 72, 56). А ў самой Горадні, паводле статыстычных дадзеных, на працягу XIX ст., рамеснікаў, занятых злотніцтвам і рэзаннем пячатак, было звыш 30 чалавек.

Юрысдыкцыя гарадзенскіх проберскіх урадаў распаўсюджвалася на тэрыторыю ўсёй губерні. Паводле статыстычных і іншых крыніцаў, на працягу XIX ст. у павятовых местах Ваўкавыску, Кобрыне і Пружанах лічба асобаў, занятых у злотніцтве, вагалася ад шасці да двух, у Бельску, Драгічыне, Мельніку, Саколцы, Янаве – ад трох да аднаго.

Спіс гарадзенскіх злотнікаў у XVI–XVIII ст.:

1. **ІЗААК** Файшовіч ("*Изаакъ Файшовичъ жыд и злотникъ места Городенского*"), 1664 – звяртаецца ў Гарадзенскі земскі суд аб нявыплаце яму з 1654 г. доўгу ў 880 "*золотых*", што застаўся пасля смерці ксяндза і каноніка віленскага, рэгента Вялікай канцылярыі ВКЛ М.Беліцкага [2, а.262–262 адв.].
2. **КОЛЬС** Ян Тэадор ("*Jan Teodor Kols*") – ювелір ЯКМ (гарадзенскі?), 3 чэрвеня 1796 г. ацаніў дыяментавы пярсцёнак доктара пана Міхельсона ў 50 чырвоных злотых [3, а.975–976 адв.].
3. **ЛУНЕЎСКІ** Тамаш ("*Tomasz Luniewski*") – старэйшы гарадзенскага злотніцкага цэху, 1637 – у прывілеі на наданне статуту цэху [4, а.1].
4. **РУСАК** Мікалай ("*Mikolaj Rusiak*") – чэляднік гарадзенскага злотніка Л.Скрабякевіча, 1638–1639 – звінавачваецца ў крадзяжы грошай у свайго гаспадара [5, а.232 адв.–233 адв.].
5. **НЕАПАЛІТАНЧЫК** Пётра ("*Piotr Neapolitanczyk*"), 1552 – злотнік каралевы Боны, атрымаў ад яе пляц пад забудову дома і агарод у Горадні [6, s.96].

6. **СКРАБЯКЕВІЧ** Лукаш (“*Lukasz Srobiakewicz*”) – злотнік гарадзенскі, 1638–1639 – у прэтэнзіях да Бернарда Кірковіча Бернадскага на некалькі тысячаў злотых [5, а.232 адв.–233 адв.].
7. **ЦВІКЛІЧ** Станіслаў (“*Stanislaw Cwiklicz*”) – злотнік гарадзенскі, 1631 – як адзін з даўжнікоў перавальскага дзяржаўцы Крыштафа Гешкоўскага [7, а.24], 1632 – на пагашэнне доўгу “*паклаў... залатых пярсценкаў з рознымі камянямі 29 і гузікаў (Paperkow) тры і паўтара тузіна, якія ацаніў у 1945 злотых, але урад, узяўшы злотнікаў і рамеснікаў знаючых*” знізіў іх кошт да 587 злотых і 15 грошаў [7, а.46 адв.–50 адв.], 1637 – фігуруе ў наданні прывілею гарадзенскім злотнікам, як адзін са старэйшых цэху [4, а.1], 1650 – у канфірмацыйным прывілеі цэху названы бурмістрам гарадзенскім [1, а.299], 1654 – бурмістр гарадзенскі, меў дом на вул.Віленскай, па суседству з арганістам Фарнага касцёла С.Чарноўскім, 1673 – у зыску да яго спадкаемцаў ад удавы ваяводы Ю.К.Глябовіча аб выплаце 65 чырвоных злотых таму, што “*шаблю не оправившы, пенензы не отдавшы, сам с того свету*” пайшоў, памёр да 25 верасня 1654 г. [8, а.260–261].
8. **ЦВІКЛІЧ** Ян (“*Jan Cwiklicz*”) – старэйшы гарадзенскага злотніцкага цэху, 1637 – у наданні статуту цэху [4, а.1], 1659 – радца мескі [8, а.10], 1661–1662 – радца мескі, 1665–1666 – радца мескі [8, а.125], 1667–1668 – бурмістр мескі [8, а.138, 157], 1671 – у тэстаменце лянтвойта гарадзенскага яго пляменніка Казімера Цвікліча, які адпісаў яму “*кунтуш лазаравы, шапку з выдры і пенендзы*” [8, а.214], 1673 – бурмістр [8, а.254 адв.].

Злотнікі, прозвішчы якіх не ўдакладнены:

1. ... АНДРЭЙ Станіслававіч (“*...Андрей Станиславович*”) – залатар гарадзенскі, 1541 – выступае з заявай у замкавым судзе аб неяўцы да адказу гарадзенскага “*каплана*” касцёлу Святога Мікалая ксяндза Яна [9, с.239].
2. … ДАМІНІК (“*...Доменік*”) – злотнік гарадзенскі, 1539 лістапад – аб знаходцы страчанага срэбнага кальца, снежань – звінавачвае татарына Янчуру ў крадзяжы срэбных цатак (упрыгожванняў да абразоў) [9, с.53, 62].
3. … ПАВЕЛ – злотнік гарадзенскі, 1539–1541 – прыцягвае да суду за нявыплату 70 грошаў двараніна П.Зеляпугу і ў іншых грашовых і маёмасных справах з рознымі асобамі [9, с.21, 78, 224, 248, 334], 1548 кастрычнік [22] “*...будучий бурмистром в месте Городенском не хотел поступити ... места бурмистровского пану Яну Ляшку ...*” [10, а.21 адв.].
4. … СТАНІСЛАЎ …боўскі (“*Станислав ...бовский*”) – злотнік гарадзенскі, 1596 траўня 9 – як асоба, што пражывала ў двары пісара ВКЛ Яраша Валовіча, атрымаў у 1595 г. ад шляхціча Станіслава Хадакоўскага 10 копаў грошаў літоўскіх, з якімі і знік у невядомым накірунку [11, а.101–101 адв.].

Спіс гарадзенскіх злотнікаў у XIX ст.:

1. **ВЯНГЛЕЎСКІ** Франц Пятровіч, былы гарадзенскі майстра залатых і срэбных спраў, дваранін, 1860 красавік – пакінуў рамяство ў сувязі з малым збытам [12, а.73], 1862 траўня 10 – звяртаецца з прашэннем да начальства прызначыць яго на пасаду пробера у Гарадзенскую казённую палату [12, а.67], лістапад – удзельнічае ў таргах Гарадзенскай пробернай установы [12, а.173–174].
2. **ВІНЧА** … … , гарадзенскі майстра залатых спраў, 1863 лістапада 26 – удзельнічае ў таргах Гарадзенскай пробернай установы [12, а.174 адв.].
3. **ГУДЭРЛЕЙ** Іван (Ян), Гарадзенскай губерні майстра срэбных спраў, 1822 кастрычнік – звярнуўся з калегамі ў Літоўскае губернскае праўленне за дазволам рабіць у Горадні вырабы 72 пробы, замест патрабуемай урадам 84 [13, а.1].

4. **КЛІМОВІЧ** … …, 1861–1862 г. – гарадзенскі майстра залатых спраў, 1863 лістапада 23–26 – удзельнічае ў таргах Гарадзенскай пробернай установы [12, а.173–174], іменнік **KLIMOWICZ** [14, с.159].
5. **КУКІН** … …, гарадзенскі майстра залатых спраў, 1863 лістапада 26 – удзельнічае ў таргах Гарадзенскай пробернай установы [12, а.174].
6. **ЛЕФАЙ** Міхаэль, гарадзенскі майстра залатых спраў, 1822 ліпень–жнівень – па прадстаўленню гарадзенскага пробера І.МІХАЭЛІСА яму забаронена займацца рамяством таму, што ён працаваў без дазволу Пробернай палаты [15, а.1].
7. **ПАЛЮТА** Антоні …, Гарадзенскай губерні майстра срэбных спраў, 1822 кастрычнік – звярнуўся разам з калегамі ў Літоўскае губернскае праўленне за дазволам рабіць у Горадні вырабы 72 пробы, замест патрабуемай урадам 84 [13, а.1].
8. **ПРЭЙЦЫХ** Якаў (Якуб) …, Гарадзенскай губерні майстра срэбных спраў, 1822 кастрычнік – звярнуўся з калегамі ў Літоўскае губернскае праўленне за дазволам рабіць у Горадні вырабы 72 пробы, замест патрабуемай урадам 84 [13, а.1].
9. **ТУБЯНСКІ** Марк Ізраэлавіч, гарадзенскі майстра залатых спраў, 1898 студзень – падаў заяву ў Віленскую акруговую проберную палату з прашэннем выдаць яму пасведчанне на права займацца рамяством [16, а.3].
10. **ШЫФЕРС** Моўша Мордхель Самуілавіч, гарадзенскі майстра залатых спраў, пражываў у доме Шылінгера на Параднай плошчы, 1898 жніўня 13 – атрымаў пастанову Віленскай акруговай управы аб "*сломке*" яго вырабаў таму, што яны не прайшлі пробы [16, а.61], 1899 студзень – мае гадавы прыбытак "*адзін фунт золата*" [17, а.2].
11. **ШЫФЕРС** Янкель Меір …, гарадзенскі майстра залатых спраў, пражываў у доме Бергмана па вуліцы Мяшчанскай,1898 лютага 17 – атрымаў пастанову Віленскай акруговай пробернай управы аб "*сломке*" 11-ці залатых кольцаў і срэбнага тавара таму, што гэта прадукцыя не прайшла законнай пробы [16, а.12], 1899 – трымае дзвух вучняў і мае гадавы прыбытак да 400 рублёў [17, а.1].

Літаратура і крыніцы:

1. НГАБ у Менску, КМФ 18, спр.123.
2. НГАБ у Менску, ф.1755, воп.1, спр.45.
3. НГАБ у Менску, ф.1711, воп.1, спр.74.
4. НГАБ у Менску, КМФ 18, спр.113.
5. НГАБ у Менску, КМФ 18, спр.316.
6. Lepszy L. Przemysł złotniczy.– Kraków,1931.
7. НГАБ у Менску, КМФ 18, спр.308.
8. НГАБ у Менску, ф.1800, воп.1.
9. АВАК.– Вильно, 1889.– Т.17.– 559 с.
10. НГАБ у Менску, КМФ 18, спр.32.
11. НГАБ у Менску, КМФ 18, спр.285.
12. НГАБ у Горадні, ф.24, воп.1, спр.2180.
13. НГАБ у Горадні ф.2, воп.3, спр.499.
14. Постникова-Лосева М.М., Платонова Н.Г., Ульянова В.Л. Золотое и серебреное дело XVI–XX вв.– М.– 1983.
15. НГАБ у Горадні ф.1, воп.1, спр.2670.
16. НГАБ у Горадні ф.24, воп.1, спр.1620.
17. НГАБ у Горадні, ф.24, воп.1, спр.1641.

Анатоль Цітоў.

"*Клерыкальныя*" беларускія гарадскія гербы ад Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

In article "*The "clerical" Belarusan urban arms from Stanisłaŭ Aŭhust Paniatoŭski*" of **Andrej Špunt** puts under doubt conclusions S.Rassadin about character of heraldic figures of the Belarusan cities: Hieraniony, Astryna, Mscisłaŭ, Voŭpa and Raduń. The author does not see in their arms of religious sense and gives an own explanation of their origin.

У сваёй працы "*Галантный век" городской геральдики Беларуси*", надрукаванай у шэрагу нумароў часопіса "*Архівы і справаводства*" на працягу 2001 г. у Менску, начальнік

скасаванай напачатку 2002 г. Дзяржаўнай геральдычнай службы Рэспублікі Беларусь, доктар гістарычных навук Сяргей Рассадзін сцьвярджае, што акрамя "*явно религиозных эмблем*", уведзеных у 1792 г. прывілеямі караля польскага і вялікага князя літоўскага Станіслава Аўгуста Панятоўскага, "*из остальных – также чуть ли не все могли иметь неявный религиозный смысл*" [1, № 2, с.100]. На самой справе, з 14-ці гарадскіх гербаў 1792 г., да групы рэлігійных можна аднесці меньш за палову (апісанні даюцца з улікам невызначанасці колераў некаторых гербаў): **Браслава** – "*Вока Боскага Наканавання*"[2, s.186], **Прывалкаў** – "*У блакітным полі Арханёл Міхаіл у блакітным панцыры і чырвонай мантыі з залатой тарчай і чырвонымі маланкамі ў правай руцэ. У падставе чорны д'ябал у чырвоным агні*" [3, a.60], **Угор'я** – "*У срэбным полі Святы Юры перамагае цмока*" [3, a.96], **Цырына** – "*У блакітным полі стаячы алень Святога Губэрта*" [3, a.136], **Шэрашова** – "*У блакітным полі ў чырвона-залатым строі арханёл Гаўрыіл з лілеяй ў руцэ, злева пальма*" [3, a.62 адв.], і нарэшце **Радашковічаў** – "*У срэбным полі Святы Стэфан пабіты камянямі*" [3, a.54 адв.]. Да "*явно религиозных эмблем*" С.Рассадзін адносіць таксама гербы наступных гарадоў: **Геранёнаў** – "*У зялёным полі чырвонае палаючае сэрца пранізанае мячом*" [3, a.64 адв.] (як эмблема "*Сердца Христова*" [1, № 2, с.100]), **Астрыны** – "*У блакітным полі срэбная вежа з чырвоным дахам, на ім збройная рука з шабляй*" [3, a.295] (як эмблема "*Башни Давидовой*" [1, № 2, с.100]), да іх далучае герб **Мсціслава** 1634 г. – "*Меч са шчытом зверху*" [2, s.406] (як эмблема "*десницы Господней*" [1, № 4, с.110]). З "*неявным религиозным смыслом*" у С.Рассадзіна выступаюць гербы: **Воўпы** – "*У блакітным полі бабёр натуральнага колеру*" [3, a.43 адв.] (як эмблема "*монашеского аскетизма*" [1, № 2, с.100]), і, нарэшце, **Радуні** – "*У срэбным полі чырвоны рак*" [3, a.150] (як эмблема "*сбрасывания ветхого Адама*" [1, № 2, с.100]). Мы ўпэўнены, што ўсе пералічаныя гербы не маюць да рэлігійных гербаў дачынення ні яўнага, ні схаванага, што і паспрабуем падмацаваць довадамі, пры больш дэтальным разглядзе.

ГЕРАНЁНЫ: "*У зялёным полі чырвонае палаючае сэрца пранізанае мячом*".



Мы адносім гэты герб да групы "*іншыя гарадскія гербы*", паколькі не можам нічога сцьвярджаць адносна яго паходжання. А.К.Цітоў, пакінуў яго па-за межамі класіфікацыі "*у сувязі з незразумеласцю сімволікі*" [4, с.39]. С.Рассадзін шкадуе на гэтую акалічнасць, паколькі, як сцвярджае: "*не очень сложная аллегория типичной католической эмблемы, воплощённая в гераненском гербе осталась неразгаданной*" [3, № 5, с.110]. "*К сожалению*,– працягвае С.Рассадзін,– *от его внимания [маецца на ўвазе А.К.Цітоў], ускользнуло, что изображение пылающего сердца, пронзённого мечом, принадлежит, по-видимому, к основному фонду католической эмблематики... **Гераненское пронзённое сердце,– безусловно, символ или Mater Dei, или самого Jesus Cristi** (вылучана А.Ш.)*" [1, № 2, с.95–96]. На гэтыя сцьвярджэнні можна запярэчыць наступнае. Па-першае, прыналежнасцю Найсвяцейшага Сэрца Езуса і Сэрца Найсвяцейшай Панны Марыі заўсёды з'яўляюцца адпаведна цярновы вянок і вянок ружовы. Па-другое, згодна прывілею Станіслава Аўгуста ад 25 траўня 1792 г., апісанне герба наступнае: "*няўдзячнае сэрца пранізанае мячом*" [3, a.64 адв.]. Цяпер зразумела, чаму няма вянка цярновага ці ружовага. У "*Літаніі да Найсвяцейшага Сэрца Езуса*" звяртаемся да Яго: "*Сэрца Езуса бязмернага маестату*", "*святыня Божая*", "*сяліба Найвышэйшага*", "*дом Божы і брама неба*", "*вогнішча міласці гаручае*", "*сяліба справядлівасці і міласці*", "*поўнае дабраты і любові*", "*цнотаў усялякіх бяздонне*", "*усялякай пахвалы найбольш дастойнае*", "*валадар і асяродак усіх сэрцаў*", "*у каторым ёсць усе скарбы мудрасці і ўмеласці*", "*у каторым прабывае ўся паўната Боства*", "*цярплівае і вялікага міласэрдзя*", "*крыніца жыцця і святасці*", "*паслушнае аж да смерці*", і г.д. [5, s.54–56]. "*Няўдзячнае сэрца*" – гэтае акрэсленне з прывілея выразна сведчыць аб тым, што галоўная фігура геранёнскага герба не мае ніякага дачынення да "*основного фонда католической эмблематики*". Аналогію можна правесці, магчыма, са шляхецкім

(уладальніцкім) гербам “*Кара*” ці “*Абарона*”, дзе прадстаўлена сэрца прабітае стралой. Такі герб атрымаў продак роду Аксакаў за тое, што згодна паданню, забіў татарскага правадыра [6, s.131].

АСТРЫНА: “*У блакітным полі срэбная вежа з чырвоным дахам, на ім збройная рука з шабляй*”.



Мы адносім гэты герб да групы “*архітэктанічныя гарадскія гербы*” з прыкметай гербаў уладальніцкай групы. Як і большасць нацыянальных архітэктанічных гарадскіх гербаў ён не адлюстроўвае рэальна існуючы помнік архітэктуры, але саму ідэю горада [4, с.21]. Ад уладальніцкай групы – “*збройная рука з шабляй*”, як адзін з варыянтаў “*Малой Пагоні*” (калі на тарчы прыведзены не ўвесь герб “*Пагоня*”, а толькі яго дэталь [7, с.368]). Здаецца, ўсё зразумела. “*Но был ли этот мотив единственным?*– задае пытанне С.Рассадзін,– *В католических литаниях Деву Марию называют также и “башней Давидовой”, и “башней из слоновой кости”. Когда в христианском искусстве башня изображалась в качестве символа, то символ этот означал, по крайней мере – иногда, твердыню, защищающую верующих от натиска адских сил*” [1, № 2, с.96]. “*Как символ именно Божьей мудрости и божественной правды в Библии упоминается меч. Поэтому сравнение палаша на рисунке к привилею 1792 г. для Острыны с мечом из герба Мстиславля 1634 г. представляется вполне уместным. Ведь в этом гербе рука в доспехах выходит из облака: следовательно, меч, который она сжимает, это именно меч Господен*” [1, № 2, с.96]. На гэтыя сцьвярджэнні можна запярэчыць наступнае. Па-першае, уся архітэктура, змешчаная ў палях тагачасных гербаў, відавочна з’яўлялася акрамя ўсяго, увасабленнем цвярдыні, што бароніць вернікаў – жыхароў горада (а вернікамі былі ўсе) ад націска варожых сілаў, і адскіх таксама. Аднак, гэта не дае ніякай падставы звязваць чыста архітэктанічныя гербы з гербамі рэлігійнымі, таму што ў такім выпадку, следуючы гэтаму штучнаму прынцыпу, – уся разнастайнасць геральдычных фігураў апынулася б у адной групе – “*рэлігійнай*”. Па сутнасці тлумачэнне амаль любога сімвалу мае працяг у рэлігійнай плоскасці, не важна – каталіцкай, праваслаўнай ці ўвогуле паганскай, а такі падыход супярэчыць прынцыпу складання геральдычных класіфікацыяў. Па-другое, тое ж самае можна аднесці і да збройнай рукі з шабляй наверсе даха, як дэталі ўладальніцкага герба.

МСЦІСЛАЎ: “*Меч са шчытом зверху*”.



Мы адносім гэты герб да групы “*алегарычныя гарадскія гербы*”, тыя што раскрываюць характар горада (прамысловы, культурны, памежны і г.д.), прылады працы, сімвалы і прадукты вытворчасці, ваенныя атрыбуты, атрыбуты навукі і культуры, геаграфічнае становішча горада, узнікненне горада (назва мясцовасці, іншыя асаблівасці і г.д.), іншыя славутасці. На паходжанне гэтага герба “*абарончай сімволікі*” [4, с.60], відавочна аказала ўплыў памежнае становішча Мсціслава на ўсходзе ВКЛ, супрацьстаяўшага перманентнай маскоўскай агрэсіі. А вось што сцьвярджае С.Рассадзін у сувязі са скасаваннем гэтага герба расейцамі: “*В российской городской геральдике использовались также гербовые эмблемы, весьма схожие с прежней мстиславльской. Конечно, такое сходство удаётся установить, если только исправить ошибку, представленную в обоих изданиях монографии А.К.Титова. То, что им, на основании оттисков городской печати на документах 1740–1767 гг., принимается за щит (то ли коричневый, то ли серебряный, но странно чешуйчатый) – на самом деле, конечно, изображение облака. Следовательно, и выходящая из него рука с мечом – вовсе не “малая Погоня”, а, скорее, сама десница Господня. Как и в гербе Вологды 1780 г.: “В красном поле выходящая из облака рука, держащая золотую державу с серебряным мечем*” [1, № 4, с.110]. На гэтыя сцьвярджэнні можна запярэчыць наступнае. Па-першае, дзіўна, але відавочна С.Рассадзін не ведае пра тое,

што дакументальным крыніцам, як прававым актам вышэйшага значэння, належыць прыярытэт над крыніцамі сфрагістычнымі [9, s.26], ці проста не ведаў пра існаванне прывілея Ўладзіслава IV Вазы ад 16 жніўня 1632 г., дзе апісанне герба наступнае: "*меч са шчытом зверху*" [2, s.405]. Па-другое, сюжэты, дзе рука з мячом выходзіць з-за воблака, будзь то герб Волагды 1780 г., ці рэверс срэбнага пфафенфайндталера 1622 г. герцага Браўншвейгскага Хрысціяна [10, с.227] – усе падобныя. Воблака там немагчыма прыняць за шчыт, таму дзіўна, што шчыт з клёпкамі і фэстонамі на гарадской пячатцы Мсціслава С.Рассадзін прыняў за воблака.

ВОЎПА: "*У блакітным полі бабёр натуральнага колеру*".

Гэтае апісанне дапушчае, што фігура павернута згодна законам геральдыкі ўправа, хаця пры гэтым, павінна агаворвацца яе пазіцыя. На выяве герба з прывілею 1792 г., бабёр, хутчэй монстр, стаіць на чатырох лапах, павернуты ўлева на фоне пэйзажу. А.К.Цітоў у сваёй інтэрпрэтацыі захоўвае паварот ўлева, затое, чамусьці, не выклікаючую пярэчанняў пазіцыю бабра стаячага (statant), перарабляе на сідзячага (sejant). Мы адносім гэты герб да групы "*анімалістычныя гарадскія гербы*". Паходжанне ўсіх анімалістычных гербаў гэтага перыяду незразумелае. Можна толькі суцяшацца больш-меньш праўдападобнымі гіпотэзамі, як напрыклад, для Воўпы, маючы на ўвазе, што старажытныя пушчы Беларусі славіліся шматлікім звяр'ём, у тым ліку і багатымі бабровымі гонамі [4, с.34]. Безумоўна, гэтая фігура, як і любы іншы сімвал, мае сваё тлумачэнне. "*Бобр, заўсёды заняты стваральнай працай, стаў сімвалам масцеравітасці і працавітасці, а ў хрысціянскай традыцыі – аскетызму*" [11, с.26]. С.Рассадзін, не схільны бачыць анімалістычны характар гэтага герба, на падставе таго, што: "*не приводится свидетельств о проживании в этом местечке также и "бобровников". Дело с волпянским гербом*,– сцьвярджае ён,– *обстояло, видимо иначе. Скорее всего, символизировал он вовсе не бобровые гоны. Чтобы расшифровать эту очередную аллегорию, нужно, кажется, учесть следующее…, среди эмблем XVIII в. имелась одна, называвшаяся "Бобр, грызущий дерево". Смысл её: "…Продолжая, перегрызёт. Терпение всё преодолевает". К этой мирской аллегории была, наверное, близка также и более ранняя, клерикальная, ведь бобр в католической традиции служил символом аскетизма, который практиковался, однако, далеко не всеми монахами…Итак, Волпа, скорее всего, получила символ, в котором был зашифрован призыв к труду, упорному и смиренному*" [1, № 2, с.98]. На ўсё гэтае можна адказаць наступнае: тлумачэнне сімволікі бабра зразумелае і не абвяргае анімалістычны характар герба Воўпы. Выснова С.Рассадзіна не дадае нічога новага, а "*неявный религиозный смысл*" можна пры жаданні ўбачыць практычна ў любым гербе.

РАДУНЬ: "*У срэбным полі чырвоны рак*".

Мы адносім гэты герб да групы "*ўладальніцкія гарадскія гербы*" (праўда, з пэўнай доляй умоўнасці). Да сучаснага перыяду (з 1991 г.) ўладальніцкія гербы ўвогуле амаль не прадстаўлены ў чыстым выглядзе. Умоўнасць выцякае з таго, што не вызначана дакладнае паходжанне дадзенага герба. Гэтая акалічнасць дала падставу А.К.Цітову аднесці герб Радуні да "*падгрупы штучных гербаў, якія маюць выявы геральдычных і негеральдычных жывёл*" [4, с.76]. З гэтым цяжка пагадзіцца. "*Незразумеласць сімволікі*" [4, с.86], выцякаючая з прычыны немагчымасці ідэнтыфікацыі, як паказвае практыка, не можа ставіць пад сумненне, што перад намі той ці іншы вядомы ўладальніцкі герб. У дадзеным выпадку – герб "*Варня*", ён жа "*Барэва*" ці проста "*Рак*", які выглядае наступным чынам: "*У срэбным полі чырвоны рак у слуп*" [12, s.157]. Такія ж гербы мелі гарады ВКЛ Воін і Філіпаў (цяпер у складзе Польшчы). Так, герб Воіна, пажалаваны ў 1555 г., згодна прывілея Жыгімонта Аўгуста, меў наступнае апісанне: "*герб*

прозываемый рак” [2, s.682]. “*В Беларуси*,– сцьвярджае С.Рассадзін,– *для придания этому членистоногому гербового статуса отсутствовали, скорее всего, не только ”торгово-хозяйственные”, но и идеологические мотивы. Ведь белорусский фольклор демонстрирует скорее отрицательное отношение к этому персонажу…Но трактовка этого образа в богословской схоластике католической Европы была совсем иной – положительной. Рак, благодаря периодической смене своего панциря, служил в ней намёком на “сбрасывание с себя ветхого Адама”, то есть на воскресение из мёртвых*” [1, № 2, с.98–99]. Што ж, відавочна і цалкам слушна, каралеўскія пажалаванні гарадскіх гербаў грунтаваліся не на “*идеологических мотивах белорусского фольклора*”.

Заганай нашых нацыянальных гарадскіх гербаў перыяду Станіслава Аўгуста Панятоўскага, па сцьвярджэнню С.Рассадзіна з’яўляецца ўбачаны ім іх “*католический*”, “*клерикальный*”, а значыць “*реакционный*” рэлігійны характар, адсутнасцю якога, насупраць, выгадна адрозніваюцца створаныя ў той жа перыяд для захопленых земляў былога ВКЛ гербы з Расійскай імперыі. “*Рассматривать гербы*,– піша ён,– *(а, точнее, эмблемы, из привилеев 1792 г. Станислава-Августа Понятовского) как достижение многовекового развития белорусской национальной геральдики, очевидно, невозможно*” [1, № 2, с.100]. “*Однако вышло так, что эти* ***явно реакционные тенденции*** *одновременно были компенсированы другой, безусловно, светской линией развития белорусской городской геральдики, преобладание которой было обеспечено в том же самом “галантном веке” благодаря трудам российской Герольдмейстерской конторы*” [1, № 3, с.115]. “*В самом деле, состоявшаяся в “галантном веке” практическая инкорпорация в общероссийскую нашей городской геральдики очевидно пошла ей на пользу. Хотя бы потому уже, что* ***откровенно клерикальные тенденции****, внедрявшиеся из Варшавы, были успешно преодолены*” [1, № 5, с.110].

Літаратура і крыніцы:

1. Рассадин С. “*Галантный век*” городской геральдики Беларуси.//АіС.– № 1.– 2001.– С.114–124; № 2.– 2001.– С.95–102; № 3.– 2001.– С.115–124; № 4.– 2001.– С.108–117; № 5.– 2001.– С.105–111.
2. Rimša E. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystes miestu antspaudai.– Vilnius: Žara, 1999.
3. РДАСА, ф. 389, воп. 1, кн. 556, арк. 60.
4. Цітоў А.К. Гарадская геральдыка Беларусі.– Мн.: Полымя, 1989.
5. Hołas dušy. Knižka da nabaženstwa dla biełarusaŭ-katalikoŭ./ Ułažyŭ ks. Stepowič K.– Wilnia: Biełaruskaje katalickaje wydawiectwa, 1934.
6. Cetwiński M., Derwich M. Herby, legendy, dawne mity.– Wrocław, 1987.
7. Цітоў А.К. Пагоня.// ЭГБ.– Мн.: БелЭн, 1999.– Т.5.
8. Бидерман Г. Энциклопедия символов.– М.: Республика, 1996.
9. Цітоў А.К. Геральдыка Беларускіх местаў.– Мн.: Полымя, 1998.
10. Винклер фон П.П. Гербы городов, губерний, областей и посадов Российской империи, внесённые в полное Собрание законов. Репринтное воспроизведение издания 1899 года.– СПб., 1990.
11. Seroka H. Lubelskie badania nad heraldyką samorządową.// Materiały do polskiego herbarza samorządowego.– Lublin, 1995.– Z.1.
12. Фенглер Х., Гироу Г., Унгер В. Словарь нумизмата.– М.: Радио и связь, 1982.
13. Тресиддер Д. Словарь символов.– М.: Фаир-Пресс, 1998.
14. Górzyński S., Kochanowski J. Herby szlachty polskiej.– Warszawa, 1994.

Андрэй Шпунт.

Фармаваньне тэрыторыі Гарадзенскага павета ў XIV–XVI ст.

In work “*The formation of territory of Horadnia region at 14th–16th c.*” **Jan Lalevič** on the basis of sources and works of the predecessors reconstructs border of Horadnia region of the GDL. The author considers the administrative status of Horadnia region, formation of its borders, boundary disputes. He judges about non-uniform ethnic and religious character of the local population caused, on his sight, that at one time considered territory was in structure annalistic Jaćviahija.

Адміністратыўны статус Гарадзенскага павета. У XVI ст. Гарадзенскі павет знаходзіўся ў складзе Троцкага ваяводства. Такі тэрытарыяльна-адміністратыўны статус ён атрымаў яшчэ ў XIV ст. Вялікі князь Гедымін прызначыў у межах уласнай Літвы ўдзелы пяці

сваім сынам. Адзін з сыноў, Кейстут атрымаў тады Трокі разам зь землямі Гарадзенскай і Берасьцейскай. У рэшце рэшт па сьмерці іншых братоў Літва была падзелена між Альгердам і Кейстутам: першы цэнтрам сваіх удзелаў меў Вільню, другі ж – Трокі. Вышэйшая ўлада была сканцэнтравана ў руках Альгерда, але на справе абодва браты былі роўныя адзін другому па ступені значнасьці і ўплыву ў ВКЛ, дзе такім чынам устанавіўся палітычны дуалізм. Кейстут быў бадай самы моцны князь сярод сваіх братоў. Бацька пасадзіў яго княжыць у такіх частках Літвы, дзе даводзілася весьці няспынную барацьбу зь немцамі і палякамі. Толькі абапіраючыся на Кейстута, які абараняў Літву з захаду, Альгерд быў у стане пашыраць літоўскія ўладаньні коштам рускіх земляў. Такім чынам, дзякуючы гістарычнай неабходнасьці засяродзіць ваенныя сілы на два франты, для абароны ад немцаў і для наступу на Русь, Літоўская зямля з паловы XIV ст. распалася на дзьве часткі, зь якіх адна стала цягнуцца да Вільні, як да свайго палітычнага цэнтра, а другая, разам з Гарадзенскім княствам – да Трокаў. Некаторыя часткі гэтых земляў пазьней атрымлівалі сыны Альгерда і Кейстута, напрыклад, у 1382 г. Ягайла, пазбавіўшы свайго дзядзьку Кейстута яго трыманьняў, аддаў Гарадзенскае княства свайму брату Скіргайлу. Але памірыўшыся зь Вітаўтам у 1385 г., вярнуў таму Горадню разам зь Берасцем і Трокамі, якія меў бацька Вітаўта Кейстут [1, с.7–10]. Ад таго часу Вітаўт называецца гарадзенскім князем аж да 1389 г., калі паўстаўшы супраць намесьніка Скіргайлы, перайшоў на бок крыжакоў. Але ўжо ад 1392 г. гэты край пераходзіць канчаткова пад кіраўніцтва Вітаўта як вялікага князя літоўскага [2, s.290].

Падставовы падзел ВКЛ на Троцкую і Віленскую паловы захаваўся на некалькі стагодзьдзяў, хоць пры гэтым трэба адзначыць пэўную асобнасьць, якой карысталася Гарадзенскага княства ў той час. Тут між іншым яшчэ з удзельнага часу былі пакінуты самастойныя намесьнікі, якія мелі пад сабой ураднікаў ніжэйшага ранга. Трокам яны падпарадкоўваліся толькі як цэнтру ваеннай акругі. Хаця пазьней назіраем выпадкі, калі функцыі ваяводы з ваенна-адміністратыўнай сфэры пераходзілі нават у вобласьць грамадзянскай падсуднасьці і пры спрыяльных умовах праяўляліся ў дзеяньні. У 1540 г. вялікі князь Жыгімонт аддаў у трыманьне сваёй жонцы Боне Горадню з валасьцямі, пры чым мясцовы стараста зь вялікакняскага намесьніка ператварыўся ў намесьніка Боны. Тады князі, паны і баяры-шляхта Гарадзенскага павета, маёнткі якіх не пайшлі ў дараваньне Боне, а адчасткі нават і не маглі пайсьці (маёнткі князёў і паноў), выйшлі з-пад прысуда гарадзенскага старосты, у якім яны дагэтуль знаходзіліся, і перайшлі пад прысуд троцкага ваяводы, які і прызначыў ім ад сябе асобных судзьдзяў [3, Т.1, отд.2, с.155].

Гарадзенская зямля ў той час зьяўлялася складовай часткай уласна Літоўскай зямлі. Гэта можна пабачыць, напрыклад, з пагадненьня Ягайлы і Кейстута з магістрам Тэўтонскага ордэна ад 1379 г. Гарадзенская зямля ў гэтай дамове адрозьніваецца ад рускіх валасьцяў, якія былі суседнімі з уладаньнямі ордэна, і гарадзенцы адрозьніваліся ад рускіх, прычым першая назва ў дамове ня раз заменена словам “*Літва*”. Горадня са сваімі валасьцямі пазначана часткай уласна Літоўскай зямлі і ў адным судовым акце, напісаным у 1532 г. у Віцебскай зямлі. Пан Іван Сапега судзіўся ў гэтым годзе з абалецкім дзяржаўцам Боны панам Кірдзеем за зямлю Кантрымаўшчыну. Апошні заявіў на судзе пану ваяводзе, што для доказу праўды сваіх прэтэнзіяў гатовы “*отчичовъ властныхъ тое земли Контрымовское поставити, которые живуть* ***въ панстве Литовскомъ*** *– одинъ* ***въ Городне****, а другой за паномъ воеводою его милостью Виленскимъ въ Ляховичохъ*” [1, с.4].

Для абазначэньня акругаў, якімі загадвалі абласныя кіраўнікі, у афіцыйнай мове ВКЛ існавалі дзьве асноўныя назвы: “*волость*” і “*повет*”. “*Волость*” у актах вывучаемага часу часьцей за ўсё акрэсьлівае ўсю сукупнасьць зямельных надзелаў, якой валодалі гаспадарскія падданыя, што складалі адну служыла-цяглую і падаткавую грамадзкую адзінку пад кіраўніцтвам намесьніка-дзяржаўцы ці цівуна. Гэтак-жа сама гэта слова ўжывалася ў стасунку да буйных княскіх і панскіх маёнткаў, якія мелі такое ж значэньне ў акрузе як і гаспадарскія валасьці. Запазычаным ад палякаў словам “*повет*” акрэсьлівалі ўрадавыя акругі розных велічыняў: і ваяводствы, і староствы, і акругі намесьнікаў-дзяржаўцаў і цівуноў і нават больш дробныя адміністратыўна аб’яднаныя тэрыторыі. У многіх выпадках слова

“*повет*” зьяўляецца раўназначным са словам “*земля*”. Таксама паветам у актах называюць і тэрыторыі меньшай за землі працягласьці і значнасьці, якія былі судова-адміністратыўнымі акругамі самастойных намесьнікаў, перайменаваных зь цягам часу ў старастаў. Так напрыклад, ад 1502 г. мы маем прывілей, дадзены князю Аляксандру Юр’евічу Гальшанскаму на 3 чалавекі “*въ Городенском повете у Скидельской волости*” [1, с.74; 4, с.144]. Гарадзенскі павет ў гэтым выпадку азначае судова-адміністратыўную акругу намесьніка-старосты гарадзенскага, які, як будзе паказана ніжэй, кіраваў самастойна, падпарадкоўваючыся троцкаму ваяводзе толькі як начальніку ваеннай акругі. Скідзельская воласць была часткай яго акругі, у якую ён выязджаў разам зь некаторымі іншымі гарадзенскімі ўраднікамі: канюшым, ключнікам і цівуном. У гэтай частцы знаходзіўся для суда і ўправы, апроч таго, асобы намесьнік, як гэта відаць з аднаго судовага ліста вялікага князя Александра.

Слова “*повет*” дадаецца да больш дробных судова-адміністратыўных акругаў, якія ў прыведзеных прыкладах найменаваны валасьцямі, калі няма ўказаньня на іх прыналежнасьць, як часткаў і пададдзелаў, да больш буйных акругаў ваяводаў і старастаў. Такім чынам, напрыклад, у 1508 г. пан Мікалай Юр’евіч Пацэвіч прасіў каля свайго двара Мількоўскага пяць службаў на імя Косцькавічаў і сем дымоў у “*Скідзельскім павеце*” [5, с.285]. Неабходна, аднак, зазначыць, што слова “*повет*”, у значэньні ўрадавых акругаў намесьнікаў-дзяржаўцаў і цівуноў, было ў большасьці выпадкаў шырэй па значэньні, чым слова “*волость*”, і не магло ім у сваю чаргу поўнасьцю замяніцца. У склад урадавай акругі намесьніка-дзяржаўцы і цівуна, як убачым ніжэй, уваходзілі ня толькі землі гаспадарскія й гаспадарскіх падданых, якія складалі гаспадарскую воласьць, але таксама землі княскія й панскія, населеныя падданымі князёў і паноў.

Складваньне межаў Гарадзенскага павета на працягу XV–першай трэці XVI ст. У часы сярэднявечча тэрыторыя ВКЛ складалася з шэрагу густа заселеных абшараў, аддзеленых вялікімі палосамі лясоў і багнаў. У XVI ст. пры нямецкай мяжы цягнулася яшчэ досыць шырокая паласа пушчы, якая паступова саступала перад засяленьнем, што ішло зь берагоў Нёмана. Занёманская пушча, якая аддзяляла Літву ад Прусіі, не была адвечнай. Ляжала тут некалі краіна, называная Судавіяй ці Яцьвягіяй, якая ў канцы XIII ст. была зьнішчана крыжакамі, каторыя ўсталявалі сваю мяжу на сярэднім цячэньні Нёмана. Паводле П.Дзюзбурга, які пісаў у першай палове XIV ст., Нёман зьяўляўся ў яго часы мяжой паміж Прусіяй і Літвой, а значыць і Гарадзенскім княствам. З наданьня Ягайлы на карысьць брата Скіргайлы ад 1387 г. відаць, што лінія Нёмана складала абарончую граніцу Літвы з боку Прусіі. Панёманскія жыхары мелі аднак свае “*входы*” ў занёманскай пушчы, таму таксама частка пушчы лічылася Літоўскай [9, s.20]. У трактаце, падпісаным Вітаўтам з крыжакамі на высьпе Салін у 1398 г., на моцы якога ён зракаўся, як вядома, на карысьць Ордэна Жамойці, упершыню была праведзена літоўска-пруская мяжа па даўнейшай яцьвяжскай тэрыторыі. Гэтая мяжа ішла ад вусьця Невяжы ў Нёман простай лініяй да зьвіліны Шэшупы, далей гэтай рэчкай аж да яе вытокаў, потым простай лініяй аж да ракі Нэты, ракой Нэтай да ракі Бобр і Бабром да Нарвы. Такім чынам, Літва досыць глыбока ўваходзіла ў яцьвяжскія тэрыторыі [9, s.21]. Пасьля перамогі ля Грунвальда літоўская граніца пасунулася яшчэ далей на захад. Зь ліста Вітаўта да імператара Жыгімонта ад 11 сакавіка 1420 г. дазнаемся, што Вітаўт лічыў “*terram Sudorum sive Gettarum, que mediat inter Lythwaniam et Prussiam*” сваёй вотчынай, у якой, маўляў, і зараз мае розныя “*входы*”, г.зн. ловы, бортнае дрэва, рыбныя азёры і г.д. Таму на гэтай падставе ён лічыць, што гэтая зямля павінна быць прызнаная яму. Па-сапраўднаму была прызнаная Вітаўту пераважная частка Судавіі на падставе трактату ад 27 верасьня 1422 г., які быў заключаны на возеры Мельна [9, s.37]. Мяжа, якая была праведзена тады паміж Прусіяй і ВКЛ, была нязьменнай фактычна да сёньняшняга часу: цяперашняя мяжа Літвы з Калінінградзкай вобласьцю Расейскай Фэдэрацыі, на польскім баку гэта – мяжа Падляшскага і Вармінска-Мазурскага ваяводстваў.

На захадзе Гарадзенскі павет гранічыў з Падляшшам. Яшчэ ў 1358 г. разьмежаваньнем Гарадзенскага княства з уласнасьцю мазавецкага князя Земавіта

Трайдзенавіча (каля 1326–1381 г.), якое правёў Кейстут, быў пакладзены пачатак афармленьню граніцы на заходняй ускраіне. Але суседзі, нягледзячы на дамоўленасьць, імкнуліся самі вырашаць зямельныя праблемы за кошт падляшскага фонду. Абраны ў 1440 г. вялікім князем Казімер Ягайлавіч (1427–1492 г.) аднавіў заходнія рубяжы, што існавалі на той час [7, с.37]. Прывілеем ад 1 студзеня 1509 г. Жыгімонт надаў райгародзкія і гонязскія землі Мікалаю Радзівілу, ваяводу троцкаму. Паводле пацьвярджэньня ад 4 студзеня 1515 г. граніца наданых уладаньняў бегла: "*a finibus Prussie continuaturque fluviolo cognomine Pruska ex Prussia profluente usque ad stagnum Nyeczko, ex stagno autem Nyeczko flumine Myetha descendendo usque ad rivum magnum alias do strumyena Jesgrzny dicto autem rivo usque ad flumen Bebra, qui iterum fluvio Bebra, usque ad fluvium Berezowa…* (далей ідзе апісаньне граніцаў Гонязскай зямлі) *…ad locum ubi flumen Lek intrat in flumen Bebra, fluvio autem Lek ascendendo ad fines Prutenorum, finibus autem Prutenorum ad fluviolam supradictam Pruska…*". Іначай, як бачым, мяжа на ўсходзе надання ад Прусіі ішла рэкамі Пруская, Мэта (Нэта), Бобр і Бярозавая [8, s.90].

Іначай справа стаіць зь межамі Гарадзенскага павета зь іншымі суб'ектамі ВКЛ. Вядома, што яны фармаваліся стыхійна, без якіх-кольвек разьмежавальных пагадненьняў.

На поўнач ад Горадні на беразе Нёмана знаходзілася крэпасьць Пералом, вядомая яшчэ з часоў войнаў з крыжакамі. З дакуманта Ягайлы, выданага ў 1387 г. на карысьць Скіргайлы, відаць, што тагачаснае Троцкае княства сягала на поўдні "*поколе мерецкая волость*", якая ляжала на поўнач ад Пералома [6, s.45]. Вынікае з гэтага, што Пераломскі павет належаў да Гарадзенскага княства. Функцыяй залежнага ад Трокаў Пералома, як і Горадні, было сьцеражэньне заходніх межаў ад нападаў з боку Ордэна. Важнасьць гэтых крэпасьцяў падкрэсьліваецца іх павятовай арганізацыяй [10, s.9]. Пры гэтым гэтыя паветы набываюць выгляд доўгіх палосаў, якія цягнуцца ад цэнтра павета да яго межаў, што відаць на прыкладзе Гарадзенскай і Пераломскай пушчаў у накірунку нямецкай мяжы. Гэта выразнае сьведчаньне, што адміністратыўныя падзелы ствараліся тут стыхійна, знаходзячыся ў цеснай сувязі з калянізацыяй. Цэнтр павета быў напачатку густа заселены і тут утварыліся адміністратыўныя асяродкі, скуль ішло засяленьне ў глыб пушчы. Пасяленцы, выходзячы з пэўнага асяродка, не зрывалі зь ім адміністратыўнай сувязі. Такім чынам, паўсталі доўгія і вузкія паветы, якія цягнуліся пушчамі да межаў краіны, што выразна паказвае шляхі, якімі ішла калянізацыя [9, s.16]. Добра гэта відаць на прыкладзе суседняга Пераломскага (часам у дакументах называецца Пераломскім і Ожскім) павета, які на поўдні гранічыў у пушчы з Гарадзенскім паветам напэўна рэчкай Аньчай (Чорная Ганьча). Лічыцца, што мяжа Пераломскага і Гарадзенскага паветаў адпавядае ў пэўнай ступені тагачаснай этнаграфічнай беларуска-літоўскай мяжы. Адсюль можна прыйсьці да высновы, што мяжа паветаў, выйшаўшы ракой Аньчай з Гарадзенскай пушчы, ішла далей па ўжо ачышчанай ад лесу занёманскай частцы менавіта мяжой паміж насельніцтвам праваслаўнага і каталіцкага веравызнаньняў. На поўнач ад Горадні знаходзілася Бальская праваслаўная парафія, яшчэ ж больш на поўнач – занёманскія тэрыторыі старажытнай Гожскай парафіі. Парафіяльны падзел захаваўся да сёньняшняга дня (занёманскую частку Гожскай парафіі з канца XVIII ст. складае сёньняшняя Селіванаўская), таму не было вялікай цяжкасьці ў вызначэньні гэтай мяжы, тым больш Ян Якубоўскі ў сваёй рэканструкцыі мапы Гарадзенскага павета ў сярэдзіне XVI ст. таксама ўказвае на такі падзел. Межы з Васілішскім і Ваўкавыскім паветамі фармаваліся напэўна яшчэ з удзельных часоў, таму галоўным фактарам тут служылі таксама прыродныя граніцы ў выглядзе лясоў, балотаў, пагоркаў. Так, ад Васілішскага павета Гарадзенскі адгароджваў велізарны абшар лесу (пазьнейшая Азёрская пушча). Важнай падставай да складваньня павятовых тэрытарыяльных адзінак была наяўнасьць водных сыстэмаў, якія ў старажытныя часы выконвалі асноўныя камунікацыйныя функцыі. Так, на поўдні Гарадзенскага павета засяленьне праводзілася пераважна па рацы Сьвіслачы. У Ваўкавыскім жа павеце гэтую функцыю выконвала Рось. Але ўсё-ж больш дакладная рэканструкцыя засноўваецца галоўным чынам на зьвестках пра гэтыя межы ў пазьнейшы пэрыяд.

Калі ў 1566 г. быў уведзены новы павятовы падзел у ВКЛ, злучаючы па некалькі меньшых паветаў у вялікія, было нармальнай рэччу, што так блізкі да Горадні дробны Пераломскі павет быў далучаны да Гарадзенскага павета. Невялікія памеры гэтага павету й блізкае яго суседзтва з Горадняй дастаткова выясьняюць яго цягненьне да гэтага горада. Гэтак-жа пастанавілі тады ж далучыць да яго паўночную частку Бельскага павета на Падляшшы. Гэтае пастанаўленьне аднак не было ўведзена ў жыцьцё, напэўна з прычыны адрозных правоў, якімі кіраваліся падляшскія паветы, якія зрэшты ў цэласьці адпалі ў 1569 г. да Кароны Польскай. Затое насуперак намярэньням заканадаўцы, які ўвесь даўні Мерацкі павет далучыў да Троцкага павета, паўднёвая частка гэтага павета, якая ляжыць у г.зв. "*запушчанскім тракце*", з Перавалкай, Берзьнікамі і Вяйсеямі была прылучана да Гарадзенскага павета. Граніца павета зблізілася тым самым да самага Мерача і да Сярэяў, а адна гарадзенская анклява апынулася аж на рацэ Кірсна (Кірсна – маёнтак князёў Масальскіх) [10, s.10]. Папраўдзе гэтак далёкае прасоўваньне граніцы Гарадзенскага павета на поўнач не было трывалым, і граніца пасунулася на поўдзень, аднак тры вышэй пералічаныя мясцовасьці засталіся ў граніцах Гарадзенскага павета да канца існаваньня даўняй Рэчы Паспалітай. Такім чынам, да Гарадзенскага павета была далучана тэрыторыя, аддзеленая ад яго пушчай і чужая яму этнічна (з балцкім насельніцтвам). Вырашальнай тут была вялікая адлегласьць ад Трокаў пры параўнальнай блізкасьці да Горадні.

У 1567 г. тэрыторыя павета павялічылася на 3 вёскі, наданыя каралём Жыгімонтам Аўгустам Грыгору Хадкевічу, віленскаму каштэляну, гетману вялікаму літоўскаму й старосту гарадзенскаму – Мялешкі й Бялевічы, якія належалі да дварца Калодзежа Ваўпянскай воласьці, і Супрасьль-Нацовічы ў Мсьцібогаўскай воласьці. Абедзьве воласьці ўваходзілі ў склад Ваўкавыскага павета. Вёскі гэтыя былі далучаны да Хадкевічавых уладаньняў Гарадок і ўвайшлі, такім чынам, у склад Гарадзенскага павета [10, s.10].

У наступныя гады граніца Гарадзенскага павета падверглася малым зьменам. Апроч адсоўваньня граніцы на поўначы з боку Мерача, належыць зазначыць адпадзеньне найболей высунутай на ўсход часткі Мастоўскай воласьці (даўняй Макрэцкай воласьці) а таксама воласьці Ражанка да Лідзкага павета [10, s.11]. Адбылося гэта ўжо ў канцы XVI ст. З таго часу граніцы павета ня зналі зьменаў аж да падзелаў Рэчы Паспалітай.

Першае, што кідаецца ў вочы, гэта вялікая прастора лясоў. Адразу можна сьцьвердзіць, што лясы займалі ў XVI ст. болей за палову абшару тагачаснага Гарадзенскага павета. Нават цяпер, па высечцы значнай іх часткі, край захаваў лясны характар. У разглядваемай эпосе лясы стваралі густую пушчу, якая акаляла скалянізаваную частку павета з трох бакоў. Пушчу паступова пранізалі дарогі, шляхі. Праз гарадзенскі край праходзіла тады між іншым вялікая дарога з Варшавы да Вільні. Такім чынам, Горадня знаходзілася на гасьцінцы, якім ехалі часта розныя купцы, рамесьнікі, паслы з Заходняй Эўропы на ўсход, у Вялікае княства Маскоўскае. У лютым 1517 г. праязджаў праз Горадню знакаміты аўстрыйскі дыплямат Сігізмунд Гэрбэрштайн. У сваіх запісках ён коратка пастараўся апісаць гэты край. "*Тамашняе княства даволі ўрадлівае, калі ж прымаць пад увагу прыроду той краіны. Гэта прыстойны горад* (Горадня - Я.Л.)*, пабудаваны на іншаземны манер*. – пісаў аўстрыйскі пасол, – *Крэпасьць з добрым горадам разьмешчаны на рацы Нёмане, называнай па-нямецку Мемелем… Я лічу гэтую раку за Кронан па падабенстве з назвай горада*" [11, с.232–233].

Уяўленьне пераносіць нас у адлеглыя часы першаснага засяленьня, калі скапленьні людзкіх пасяленьняў стваралі астравы ў лясной пушчы. Сама пушча першасна была ўласнасьцю нічыёй. Толькі зь цягам часу прылягаючыя да пушчы скапленьні пасяленцаў уварваліся ў лясныя адступы і паступова іх асвоілі. Да павету былі далучаны некаторыя пасяленьні, якія паўсталі на тамашнім баку пушчы (Шэмбелеўская воласьць і землі Даўспуда на поўначы, Заблудаўская воласьць на поўдні). Калі ў 1566 г. была пашырана граніца Гарадзенскага павету, далучаныя былі да яго ня толькі цэлы малы Пераломскі павет, але і паўднёвая "*запушчанская*" частка Мерацкага павету [10, s.4].

Такім чынам, зьнікла натуральная граніца павету, якой была першасная пушча, затое паўстала характэрная для новага часу штучная граніца. Штучнай таксама зьяўляецца цалкам заходняя мяжа, якая бяжыць уздоўж рэкаў і азёраў.

Намэнклатура гэаграфічных назоваў дае нам магчымасьць адкрыць этнічны характар краю. Назвы валасьцянскіх вёсак на галоўным засяленчым абшары ў агромнай большасьці беларускія, што сьведчыць аб досыць суцэльным беларускім характары вясковага насельніцтва.

Сустракаем аднак даволі шмат назваў мясцовасьцяў, якія маюць балцкае гучаньне, як Доргунты (Дваргунты), Путрышкі, Русота, Намейкшы, Салаты, Бершты, Спуша, Лаўна, Трумпі, Одла, Уснар, Шлумпічы. Зьвяртаюць увагу пасяленьні дробнай шляхты з радавымі балцкімі назовамі, як Эйсымонты, Ядкевічы (Ёдкі), Пачобуты (Подчобуты), Цыдзікі. Побач маем аднак шляхецкія пасяленьні з родавымі ўсходнеславянскімі назовамі, як Абуховічы, Палуяны, Глебавічы. Звяртае ўвагу факт, што цэнтрамі воласьцяў зьяўляюцца ў значнай ступені мясцовасьці з балцкім гучаньнем, як Перстунь, Лабна, Індура, Котра, Скідзель, Верцялішкі. Балцкімі таксама зьяўляюцца і назовы рэкаў, такія як Нёман, Ганьча, Котра, Пыра (Пера), Сьвіслач, Зэльва, Воўпа, Сідра, Саколда, Даўспуда. Побач з тым маем, аднак, і чыста славянскія, як Бобр, Бярозавая, Чарнуха, Чарлёна, Ласосна.

Вышэйпададзенае дазваляе нам акрэсьліць этнічны склад галоўнай, цэнтральнай часткі павету як мяшаны балцка-славянскі, з колькаснай перавагай, аднак, славянскага элемэнту. У разглядваем намі эпосе здаецца, што надышла тут ужо цалкавітая моўная асыміляцыя абодвух этнічных групаў, а менавіта славянская (беларуская) мова сталася пабытовай мовай усяго насельніцтва, этнічная розьніца выражалася ўжо толькі ў веравызнаньні: балты (ліцьвіны) былі каталікамі, славяне (русіны) – вызнаўцамі праваслаўя. Аб раўназначнасьці абодвух народаў, а дакладней вызнаньняў, сведчыць факт, што наймагутны з тутэйшых магнатаў Грыгоры Хадкевіч, сам “*рускай*” веры, фундуе ў сваім мястэчку Заблудаве ня толькі праваслаўную царкву, але і каталіцкі касьцёл [10, s.4].

Адрозны ў этнічным сэнсе характар мелі паўночныя воласьці, “*запушчанскія*”. Далучаная да Гарадзенскага павету ў 1566 г. паўднёвая частка даўняга Мерацкага павету мела балцкае насельніцтва, тыя ж пасяленьні, якія ляжалі пры прускай мяжы, мелі часткова польскае (мазурскае) насельніцтва.

Паводле трэцяга падзелу Гарадзенскі павет быў распалавінены: усходняя частка з Горадняй дасталася Расеі, заходняя частка з Сувалкамі, Сэйнамі і Саколкай – Прусіі. Калі немцы ўвялі на сваёй тэрыторыі новы падзел на паветы, то Расея захавала даўні. Пазбаўлены папраўдзе сваёй заходняй паловы, але з усходняга боку захоўваючы даўнія свае межы, даўні Гарадзенскі павет застаўся пад расейскім панаваньнем. З малымі зьменамі захаваў ён гэтыя граніцы і ў міжваеннай Польшчы, даючы яскравы прыклад трываласьці даўніх адміністрацыйных граніцаў.

Спрэчкі на падляшскім памежжы. Вядома, што даўнія вякі не зналі выразных, пазначаных на тэрыторыі і акрэсленых на мапе палітычных і адміністрацыйных граніцаў. Можна было казаць хутчэй аб палосах, чым аб памежных лініях. Гэтыя палосы паволі, умеру росту засяленьня звужаліся, каб стацца, нарэшце, граніцай у сучасным разуменьні гэтага паняцьця, г.зн. зблізіцца да ідэальнага паняцьця лініі, пазначанай на тэрыторыі і акрэсленай на мапе. Калі разуменьне гранічнай лініі з’явілася, заставалася яшчэ цяжкасць пазначэньня яе на тэрыторыі. Як доўга праходзілі засяленчыя працэсы, дык гранічныя лініі, якія былі лініямі сутыкненьня двух каланізацыйных плыняў, падвяргаліся не раз досыць значным зменам. Вынікалі адсюль частыя спрэчкі аб праходжаньні граніцы. Як сур’ёзным зменам магла падвергнуцца гранічная лінія ў выніку пасоўваньня засяленьня ўглыб гранічнай пушчы, бачым на прыкладзе падляшска-гарадзенскай граніцы ў першай палове XVI ст.

Паміж Падляшшам і Гарадзенскай зямлёй распасціралася ў гэтыя часы пушча, некалі заселеная вынішчанымі ў XIII ст. яцьвягамі ці судавамі. Пушча была вялікакняскай і залічвалася да Гарадзенскай зямлі. Таксама тамашнія людзі мелі ў ёй свае “*входы*” ці ўжытковыя правы, і абавязаны былі сцерагчы яе на карысць вялікага князя. Да гэтай пушчы

аднак, прылягалі падляшскія воласьці, Райгорад і Гонязь, якія ў 1509 г. былі наданы віленскаму ваяводзе Мікалаю Радзівілу [8, s.89]. З гэтых воласьцяў пачало шырыцца засяленьне ўглыб вялікакняскай пушчы, як Гарадзенскай так і суседняй Бельскай. Такім чынам, коштам вялікакняскіх лясоў павялічваліся радзівілаўскія воласьці.

Хутка Радзівілаў заатакавала Бона. Яе напад на граніцы гонязска-райгародскіх уладаньняў быў адначасова пачаткам яе барацьбы за злом перавагі магутных родаў. Бона выкарыстала пры тым варожы стасунак гонязскай і райгародскай шляхты да Радзівілаў. У 1528 г. Бона прыбыла з вялікім князем у ВКЛ і магла асабіста запазнацца са станам сваіх уладаньняў. Ацэнка стану была негатыўная. Экстэнсіўна праводзімая на вялікіх абшарах гаспадарка давала мізэрныя даходы [8, s.97]. Адначасова Бона ўмяшалася ў зацятыя спрэчкі паміж Гаштольдамі і Радзівіламі, якія між іншым спрачаліся за граніцу сваіх валоданьняў – паміж Тыкоцінам і Гонязям. Уладальнік Тыкоціна канцлер Ольбрахт Гаштольд сьцьвярджаў, што Радзівілы бяспраўна захапілі суседнія вялікакняскія землі. Гэта было на руку Боне. Біскуп Мікалай Радзівіл, хочучы папярэдзіць расправу, запісаў 18 снежня 1528 г. маладому Жыгімонту Аўгусту Кнышын з ваколіцамі, засьцерагаючы, аднак, сабе адначасова пажыцьцёвае трыманне [12, s.97]. Мікалай Радзівіл памёр два гады пазней. Хутка па яго смерці вялікі князь выслаў у Кнышын Івана Кунцэвіча, з мэтай пераняць гэтыя маёнткі. Тым часам, Станіслаў Радзівіл, брат біскупа, не могучы пагадзіцца са стратай Кнышына, насяліў яго сваімі людзьмі. У гэтай сітуацыі Жыгімонт Стары склікаў паспалітае рушэньне Бельскай зямлі і пагразіў Радзівілу пакараньнямі. Станіслаў Радзівіл саступіў. Вялікі князь пераняў на сябе Кнышын [12, s.98]. Нягледзячы на запіс біскупа Мікалая Радзівіла Кнышына з ваколіцамі на Жыгімонта Аўгуста, Бона, выкарыстоўваючы варожы стасунак да Радзівілаў шляхты і гаспадарскіх асочнікаў, спрычынілася да ўзбуджэньня супраць іх працэсу, аскарджваючы іх за заняцьце вялікакняскай зямлі.

Жыгімонт Стары ў 1529 г. выслаў спецыяльную камісію, якая мела на месцы вывучыць справу. Эфектам працы камісіі на падставе сведчаньняў шляхты і асочнікаў было сцьвярджэнне, што ваявода віленскі і канцлер ВКЛ Мікалай Радзівіл прыўлашчыў сабе велізарныя прасторы Бельскай і Гарадзенскай пушчаў, належачыя да вялікага князя, і бяспраўна далучыў да сваіх гонязска-райгародскіх валоданьняў [8, s.98].

Аднак істотнае вырашэньне гэтай справы наступіла толькі ў 1536 г. У гэтым годзе вялікі князь Жыгімонт Стары надаў Горадню маладому княжычу Жыгімонту Аўгусту [13, s.161]. У намесніцтве маладога вялікі князь выступае вялікая княгіня Бона, каторая жадае, каб новаскаланізаваныя гранічныя абшары былі адняты ў Радзівілаў і вернуты Горадні і Бельску. Тагачасны ўладальнік Райгораду і Гонязі Ян Радзівіл, староста жамойцкі і падчашы ВКЛ, згаджаецца на кампрамісны суд у гэтай справе. 24 траўня ў Вільні адбылося судовае разбіральніцтва перад вялікім князем. Жыгімонт, прымаючы прадстаўленыя камісіяй довады і адкідваючы радзівілаўскія, даручыў правесьці новае межаваньне гонязска-райгародскіх земляў. Была выслана новая, супольная камісія: з боку Боны – Юры Хвальчэўскі, біскуп луцкі, Шымко Мацкевіч, віленскі цівун, Балтазар Паткоўскі, земскі суддзя бельскі. Ян Радзівіл прызначыў сваімі камісарамі князя Івана Палубінскага, Станіслава Скопа, вялікакняскага сакратара і Станіслава Орвіда, цівуна цельшаўскага. Абодвума бакамі мелі быць абраны арбітры з вялікім князем як суперарбітрам на чале, якія, з'ехаўшыся на месца і выслухаўшы сведчаньні мясцовых людзей, мусілі вызначыць граніцу паміж Райгорадам і Гонязем з аднаго і староствамі Гарадзенскім і Бельскім з другога боку. Вызначэнне граніцы сапраўды наступіла, але не ў выніку паразумення абодвух бакоў, а аднабакова арбітрамі маладога княжыча, бо нельга было паразумецца з арбітрамі Радзівіла ў пытаньні, скуль на нямецкай мяжы трэба распачаць праводзіць граніцу. Камісары Боны сцьвярджалі, што каля вёскі Прапёркі, у месцы званым Каменны Лог, а Радзівіл – што ракой Пруская, дзе былі ўжо падрыхтаваныя лёжы, якія ў начы камісары пакінулі і збурылі. Камісары Боны не саступілі, таму Ян Радзівіл адклікаў сваіх камісараў [13, s.162]. Размежаванне праводзіў, такім чынам, толькі сам заінтэрэсаваны бок на падставе вялікай колькасці сведкаў спасярод мясцовай шляхты, сцягнутай ураднікамі Боны. Гэтыя сведкі даводзілі, дзе быццам бегла некалі граніца

між райгародскімі і гарадзенскімі землямі. Ідучы за імі камісары загадвалі сыпаць гранічныя капцы. Сведкі сцвярджалі, што "*зямля па левай руцы (г.зн. па баку возера Нэцкае) заўсёды ад найдаўнейшых часоў належала і належыць да гарадзенскіх уладанняў... і што шмат гэтых людзей, якіх клічуць асочнікамі і бортнікамі, маюць свае борці, а ў іх свае знакі, называныя клейны, і дасюль існуюць рэшткі халупаў і лазняў, якія мелі на гэтай зямлі людзі, належачыя да Горадні, для сваёй патрэбы, жыхарання і чысціні, і князь Міхал Глінскі ніколі за згаданыя граніцы ў гэтую ж гарадзенскую зямлю, якія ляжаць па левай руцы, не ўваходзіў, і людзі яму не належалі, але толькі вяльможны некалі Мікалай Радзівіл, ваявода віленскі, сілай і гвалтам з гэтых належных да Горадні лясоў і бароў выгнаў бортнікаў і асочнікаў, а па яго смерці дзеці яго разам з маткай пачалі новыя вёскі закладаць, якія знаходзяцца па левым баку на гарадзенскай зямлі*". Насыпанне гранічных капцоў праводзіў падкаморы бельскі Ян Скварак з Осава, г.зн. Гансоўскі, з вёскі Гансоўка-Осава. Камісія працавала ад 1 да 4 лістапада 1536 г. Акт размежаваньня, маючы 24 карты, датаваны ў Каменным Логу, вялікі князь зацьвердзіў у Кракаве 25 лістапада 1536 г., далучаючы частку земляў Радзівілаў да земляў Жыгімонта Аўгуста. Ян Радзівіл яшчэ стараўся падбухторваць войтаў і сялянаў супраць вялікакняскіх ураднікаў, якія займалі яго землі. Але вялікі князь у канцы 1536 г. пагрозіў высокімі пакараннямі. Гэтае аднабаковае рашэнне арбітраў вялікі князь зацьвердзіў і загадаў правесці ўвядзеньне маладога княжыча ў спрэчныя абшары. З зацьверджанага вялікім князем выраку кампраміснага суда можам здабыць дакладнае разуменьне аб праходжаньні даўняй падляшска-гарадзенскай мяжы [8, s.99].

Новая граніца распачыналася ад прускай мяжы недалёка ад Райгораду. Там насыпалі два капцы, адкуль мяжа бегла сярэдзінай Каменнага Лога, затым праз лес да Шэлістоўскай Белі і стуль да рэчкі Шэлістоўкі (Салістоўка), гэтай рэчкай да ставу і праз вёску Шэлістова, якую трымаў пан Жрэбка (сёння вёска Жробкі), далей гэтай рэчкай каля Мацея Баршча з Райгорада, праз возера Дрэнства, і рэкамі Егжняй і Лэгам да Бобра. Далей рэчкай Смагароўкай (Беблай) аж да яе вытокаў, адсюль простай лініяй аж да вытокаў ракі Нераслі, далей гэтай жа ракой аж да яе вусця ў Нарву [12, s.99]. Зразумела, што лінія тых рэкаў і азёраў была толькі прыблізнай лініяй. На гэтых рэках былі шматлікія пасяленьні, якія распасціраліся на абодвух берагах. А паколькі фактычная гранічная лінія не магла праходзіць праз сярэдзіны пасяленьняў, дык трэба было раз за разам рабіць адступленьні ад гэтай ідэальнай лініі. Гэтая лінія стала заходняй граніцай Гарадзенскай і Бельскай воласцяў. Як вялікія тэрыторыі пасля гэтага страцілі з цягам часу абедзьве гэтыя воласьці, убачым на мапе, калі правядзем там як цяперашнюю новую граніцу так і старую граніцу, якая шла ад прускай граніцы рэчкай Прускай, возерам Нэцкае, рэкамі Мэтай (Нэтай), Бярозаўкай і Чорнай (званай у ніжнім сваім цячэньні Саколдкай). Радзівілы мусілі пагадзіцца са стратай значнай часткі сваіх уладаньняў: паласы даўжынёй каля 69 км, а шырынёй ад 12 да 21 км, у тым ліку да 20 свежазаснаваных вёскаў. Здабытак Боны быў вялікі [8, s.99].

Памыляўся Я.Якубоўскі, мяркуючы, што Бона забрала няслушна прыўлашчаныя землі [13, s.164]. Калі ж акт надання ад 1509 г. для Радзівілаў не быў фальшывы, дык граніцы іх былі праўдзівыя. Праведзенае Бонай размежаваньне было нязгоднае як з прывілеямі наданьня для Радзівілаў, якія дакладна апісалі граніцы наданьня, так і са старой райгародскай граніцай, якая бегла ад вякоў ракой Прускай, возерам Нэцкае да Бабра, а таксама гонязскай граніцай, якая таксама ад вякоў бегла ракой Бярозавай. Рака Пруская нават у іншых актах з гэтага часу, якія не датычыліся Радзівілаў, заўсёды называлася райгародскай граніцай [8, s.100]. Таму забраныя землі, хоць іх адлучылі ад Падляшскага ваяводства і прыдзялілі да Гарадзенскага павета, у хуткім часе вярнуліся да Падляшша, а потым да адміністрацыйнай лучнасьці з Гонязям і Райгорадам [12, s.101]. Акт размежаваньня быў праведзены насуперак прывілеям і абапіраўся на фальшывых сведчаньнях шматлікіх ворагаў Радзівілаў, як сярод шляхты, так і сялянаў. Камісары пераказалі адабраныя землі пад кіраваньне намесніку з Лабна (пад Горадняй) Юрыю Зеляпузе [12, s.101].

Паўднёвую частку забраных ад Радзівілаў земляў далучылі да бельскіх уладаньняў, а паўночную частку да гарадзенскіх уладаньняў. Гэта былі землі паміж возерам Дрэнства і возерам Нэцкае, а такім чынам і корчмы на Нэце.

Уся гэта паласа зямлі была прызнана маладому княжычу як прыналежнасць Горадні і Бельска. Быў зроблены аднак вынятак для пэўнай колькасці вёсак. Менавіта тры вёскі, якія ляжалі паміж Бабром і Смагароўкай (Беблай): Далістаў, Смагароўка і Манюшкі, былі пакінуты на вялікакняскае рашэньне, бо пабудаваны яны былі папраўдзе на гарадзенскай зямлі, але яшчэ пры вялікім князі Казімеры Ягайлавічы. Былі вылучаны таксама землі Каліноўка, якія ляжалі на ўсход ад верхняй Нераслі, на якія Ян Радзівіл прадставіў прывілей, наданы яго бацьку вялікім князем Аляксандрам. Абшар, ахоплены абедзьвюма граніцамі, старой і новай, уяўляў некалі вялікакняскую пушчу, якая ў паўночнай і сярэдзіннай сваёй частцы належала да Гарадзенскага павета, у паўднёвай жа, шырэйшай – да Бельскай зямлі [13, s.163].

Што тычыць той паўднёвай часткі спрэчнай тэрыторыі, якая знаходзілася паміж рэкамі Нерасляй, Нарэвам, Супрасляй і Чорнай (Саколдкай) іначай г.зв. Бельскай пушчы, дык на падвойнай падставе гэты абшар быў прызнаны за маладым княжычам: па-першае, як даўняя прыналежнасць Бельскага староства, па-другое, як новая маёмасць Кнышын, якая незаконна была заснавана ў вялікакняскай пушчы ваяводам віленскім Мікалаем Радзівілам, а затым у 1528 г. запісана маладому княжычу сынам яго Мікалаем, біскупам жамойцкім. Такім чынам, малады княжыч, а дакладней кіруючая ад яго імя вялікая княгіня Бона стала ўладальніцай не толькі двух даўніх старостваў, Гарадзенскага і Бельскага, але і незаконна заселеных кнышынскіх земляў, а таксама цэлага шэрагу пасяленьняў, якія цягнуліся на гарадзенска-падляшскім памежжы, на той падставе, што закладзены яны былі на вялікакняскай зямлі без дазваленьня вялікага князя. Здавалася б, што павінны яны былі быць зараз далучаны да Гарадзенскага і Бельскага старостваў, бо паўсталі на зямлі, каторая некалі належала да гэтых старастваў [13, s.164]. Тым часам далейшы лёс іх быў іншы. Яшчэ да 1544 г. (напэўна адразу ж па смерці Ю.Зеляпугі) вялікакняскія вёскі паміж азёрамі Дрэнства і Нэцкае перанеслі з гарадзенскіх уладаньняў да кнышынскіх. З земляў, адабраных ад Радзівілаў, была ўтворана вялікая адзінка вялікакняскіх уладаньняў, а рака Пруская і Нэта зноўку сталіся граніцай [8, s.104]. Нядоўга, аднак, доўжылася асобнае жыцьцё гэтых тэрыторыяў. У 1569 г. яны зноў вярнуліся да адміністрацыйнай лучнасьці з Гонязям і Райгорадам, а мяжа радзівілаўскіх уладаньняў да 1536 г. сталася ў 1569 г. падляшска-гарадзенскай мяжой – мяжой ВКЛ і Кароны Польскай [12, s.101].

Каланізатарская акцыя, распачатая Радзівілам, была працягнута вялікім князем. На паўночных ускраінах спрэчнай некалі тэрыторыі, над возерам Нэцкае паўстала ў 1555 г. новае пасяленьне з вялікакняскім дваром, названае ад вялікакняскага імя Аўгуставым. Гэтае пасяленьне перад самай Люблінскай вуніяй сталася цэнтрам новазаснаванага Аўгустоўскага староства, якое ахапіла тады ўжо поўнасцю скаланізаваную паўночную частку спрэчнага некалі абшару. Такім чынам, засяленьне, якое ішло з Падляшша, не было замаруджана адабраньнем спрэчных абшараў у Радзівілаў, а наадварот знайшло магутных апякуноў у новых уладальніках – вялікай княгіні-маці і ў маладым княжычы.

Што тычыць павятовай прыналежнасьці спрэчных некалі абшараў, дык у 1566 г. пры ўвядзеньні новага адміністрацыйнага падзелу ВКЛ была ўчынена спроба залічэньня да Гарадзенскага павету не толькі Кнышына і Аўгустова, але гэтак жа Райгораду, Гонязі і Тыкоціна. Спроба гэтая, аднак, не ўдалася: усе гэтыя тэрыторыі ўжо так зрасліся з Падляшшам, што ўвайшлі ў склад новага Падляшскага ваяводства, якое ў 1569 г. было ўключана да Кароны. Такім чынам, падляшска-гарадзенская граніца да 1536 г. сталася граніцай паміж ВКЛ і Каронай Польскай і такой засталася аж да падзелаў [12, s.101].

Літаратура і крыніцы:

1. Любавский М. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского Статута.– М., 1892.

2. Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska pod względem historycznym, geograficznym i statystycznym opisana.– Warszawa, 1843–1886.– T.I–IV.
3. АВАК.– Вильно, 1865.– Т.1.
4. Lietuvos Metrika: Литовская Метрика. (1387–1546).– Vilnius, 1998.– Kn. 25.
5. Lietuvos Metrika: Литовская Метрика. (1499–1514).– Vilnius, 1995.– Kn. 8.
6. Jakubowski J. Opis Księstwa Trockiego z r. 1387.// Przegląd historyczny.– Warszawa, 1907.– T.V.
7. Казлоў Л., Цітоў А. Беларусь на сямі рубяжах.– Мн.: Беларусь, 1993.
8. Wiśniewski J. Dzieje osadnictwa w powiecie Augustowskim od XV do końca XVIII wieku.// Studia i materiały do dziejów Pojezierza Augustowskiego./ Pod red. J.Antoniewicza.– Białystok, 1967.– S.13–294.
9. Jakubowski J. Mapa Wielkiego księstwa Litewskiego w połowie XVI wieku. Część północna.– Lwów, 1927.
10. Jakubowski J. Powiat Grodzieński w w. XVI. Mapa w skali 1:400 000 (z tekstem).– Kraków, 1934.
11. Герберштейн С. Записки о Московии.– М.: Изд-во МГУ, 1988.
12. Malczewska M. Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku.– Warszawa–Poznań, 1995.
13. Jakubowski J. Przykład zmienności granic administracyjnych na Litwie w w. XVI.// Ateneum Wileńskie.–1935.

Ян Лялевіч.

Лёс шляхцянак ў вайне 1654–1667 г.

In article "*The destiny of the noblewomen in war 1654–1667 years*" **Natalla Sliž** considers heavy destiny of the women during war of Reč Paspalitaja (Republic) with the Moscow state. The author on the basis of the wills, complaints and memoirs shows human, material and moral losses of the population of GDL, among which the tragedy of the women appears especially brightly.

Вайна паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй у 1654–1667 г. не так даўно ўвайшла ў беларускую гістарыяграфію і стала шырока абмякоўвацца ў навуковай літаратуры [6, 7, 8, 10]. Да пачатку 90-х г. яна ўскосна закраналася ў працах або проста замоўчвалася, бо разгляд гэтай падзеі не ўваходзіў у агульнапрынятую ідэалагічную канцэпцыю. Аднак і на сённяшні дзень нельга сказаць, што дадзеная тэма цалкам даследавана і вычарпана для гісторыкаў. Вывучэння патрабуць не толькі вайсковыя падзеі, але і жыццё асобных людзей пад час вайны.

Крыніцы перыяду 1654–1667 г. і нават пасля яго адрозніваюцца ад крыніцаў такога ж тыпу, але за мірны час. На змены ў афіцыйнай і прыватнай дакументацыі звярнуў увагу беларускі даследчык Максім Гардзееў. Ён адзначыў змяненні ва інтытуляцыі і ў змесце дакументаў, якія змешчаны ў кнігах Полацкага магістрата за гэты час. Аналіз дакументаў вёўся ім на падставе адной ацалелай магістрацкай кнігі за 1656–1657 г., бо амаль увесь магістрацкі архіў згарэў [2]. У сувязі з вайсковымі падзеямі справаводства прыцярпела змены і ў магістрацкія кнігі патрапілі дакументы нават ад мясцовай шляхты. Сярод матэрыялаў, якія адлюстроўваюць падзеі вайны і лёс асобы ў вайне, варта адзначыць прыватна-прававыя дакументы рознага кшталту (тэстаменты, скаргі і інш.). Акрамя іх перыяд вайны асвятляюць тагачасныя ўспаміны, дыярыюшы і казанні на смерць. Вайна настолькі ўзрушыла і змяніла жыццё шляхты, што ўсе дакументы маюць нават эмацыйную афарбоўку. У артыкуле будзе звернута ўвага на лёс шляхцянак у віхуры гістарычных падзеяў, стаўленне жанчынаў да іх, панесяныя імі страты.

Маскоўская дзяржава (Расія) была заўсёды небяспечным суседам для ВКЛ. Войны, сутычкі на мяжы адбываліся амаль увесь час з невялікімі перапынкамі. Яны часта вылучаліся жахлівымі і крывавымі падзеямі. Аднак, вайна 1654–1667 г. вызначалася вялікай колькасцю разбурэнняў і чалавечых стратаў. У некаторых паветах яны дайшлі да 98 % [1]. Напрыклад, вялікія страты людскія і маёмасныя ў Ашмянскім павеце ад "*тырана ваяводы маскоўскага*" зафіксаваў у сваім тэстаменце шляхціц Ашмянскага павета Крыштаф Горман (1661 г.) [4, ф. 1732, воп.1, спр.1, арк.6]. Пры ўзяцці гарадоў (Магілёў, Віцебск, Мсціслаўль і інш.) вораг не шкадаваў нікога і нічога, пакідаючы пасля сябе спаленыя населяныя пункты і забітых жыхароў [7, с.18–27]. Ян Цадроўскі апісаў вялікі голад, які панаваў на тэрыторыі ВКЛ у 1656–1657 г., калі галодныя людзі елі не толькі катоў і сабак, але нават і памерлых, а таксама занатаваў пра маравое паветра 1657–1658 г., якое прынесла шмат чалавечых стратаў [5, с.18–27]. Вайсковыя падзеі ахапілі амаль усю тэрыторыю ВКЛ, яны закранулі прадстаўнікоў усіх саслоўяў: ад шляхты да селяніна, незалежна ад полу і ўзросту.

Найменьш абароненай катэгорыяй былі жанчыны і дзеці. Аб іх цяжкай доле ўзгадваецца ў розных крыніцах. Найбольш падрабязна лёс шляхцянак прадстаўлены ва ўласна іх тэстаментах і тэстаментах сваякоў. Феліцыяна Горская склала свой тэстамент, калі знаходзілася ў палоне ў Свяйску (1656 г.). Небяспека ад маравога паветра і хвароба вымусілі яе напісаць яго. Дакумент пачынаецца з падрабязнага апісання адбыўшыхся з ёй падзеяў, а не з інвакацыі, якая ўласціва пачатковаму пратаколу, як гэта сустракаецца ў большасці шляхецкіх тэстаментаў мірнага часу [9]. Жанчына патрапіла ў палон разам са сваім першым мужам віцебскім ротмістрам Крыштафам Асіпоўскім у Віцебскім замку (1654 г.). Ён хутка памёр у Яраслаўлі. Праз паўтары гады яна выйшла другі раз замуж за старадубаўскага падкаморыя Казімера Стравінскага (1656 г.). Але шлюб быў нядоўгім – муж памёр ад маравога паветра ў тым жа годзе, пакінуўшы яе цяжарнай. Старадубаўскі падкаморы запісаў ёй і свайму будучаму нашчадку маёнтак Якаўлевічы ў Северскай зямлі, рухомыя рэчы і грошы, а таксама зрабіў ахвяраванні на касцёлы. З-за хваробы і пакутаў Ф.Горская страціла дзіця. Пасля расповяду пра падзеі свайго жыцця яна перайшла менавіта да апошніх распараджэнняў. Як таго патрабавала традыцыя, шляхцянка даручала сваю душу Богу, а цела прасіла пахаваць побач з целам другога мужа. Пасля двух сужэнцаў яна атрымала 26 000 злотых: 16 000 запісаных на Серадкаротні (Віцебскае ваяводства) ад К.Асіпоўскага і 10 000 – ад К.Стравінскага. Частка маёмасці была аддадзена віцебскім езуітам, каб яны купілі пляц і пабудавалі на ім дом для ўдоваў і сіротаў. Яны павінны былі атрымліваць усё неабходнае для жыцця і маліцца за яе душу і душы сужэнцаў. У той час стварэнне такіх дамоў было сапраўды актуальным. Акрамя гэтага вылучалася сума для вучобы бедных студэнтаў, якія павінны былі спяваць за яе душу малітвы кожны вечар. Дамініканскаму кляштару ў Віцебску трэба было вярнуць касцёльныя рэчы, якія атрымаў першы муж на захаванне. Яны былі перададзены Аляксандру Войне і яго жонцы. Астатняя маёмасць прызначалася дзецям ад першага шлюбу Рафалу і Крысціне. Апякунамі для сына і дачкі прызначаліся віцебскі войскі Казімер Шапка Хатольскі, віцебскі падстароста Дамашэўскі, віцебскі гродскі пісар Крыштаф Бранскі Бялецкі, віцебскі ротмістр Марцін Станіслаў Валадковіч [2, с.342][1]. Дакумент падпісалі шляхціцы, якія знаходзіліся ў палоне: дэрпскі падкаморы і віцебскі падсудак Мікалай з Брусілава Кісель, віцебскі лоўчы Базыль Якімовіч Галаўня і Церлікоўскі (імя адсутнічае). Складальнікі выдання адзначылі ў заўвагах да гэтай крыніцы, што палонныя не ўзгадвалі пра цяжкае становішча ў палоне і нават мелі там маёмасць, але змест цалкам супярэчыць гэтым высновам [2, с.330–339]. Феліцыяна Горская хоць і не адзначала дэталі побыту, аднак яна ўзгадала аб хваробах, пакутах, выкідышы, эпідэміях, смерці сужэнцаў. Гэта ўсё не магло адбыцца пры добрых умовах жыцця, а што да яе маёмасці – то ўся яна знаходзілася на тэрыторыі ВКЛ. Тэндыцыйнасць і ідэалагічнасць у ацэнках дакументу выдавочная. Нягледзячы на факты, аўтары выдання імкнуліся апраўдаць інтэрвенцыю Маскоўскай дзяржавы ў ВКЛ.

Ганна Матушэвічоўна Кучук напісала свой тэстамент ў 1657 г., актыкаваны ён быў у гродскім судзе Ашмянскага павета ў 1675 г. Месца яго напісання – Казань: г.зн. дакумент быў складзены ў палоне. Разам з дачкой Марыянай (1647–?) яе захапілі маскоўскія войскі ва ўласным маёнтку Турлаўшчызна (Ашмянскі павет) у 1655 г. Сваім апякунам і дабрадзеям у палоне яна называе Андрэя Афанасавіча Кармоцкага. Ён спрыяў яе другому шлюбу з шляхціцам Мсціслаўскага павета Лявонам Кучукам (1657 г.), які патрапіў у няволю пры аблозе Віцебскага замку. Хвароба прымусіла скласці жанчыну дакумент апошняй волі. Ганна Матушэвічоўна прасіла, каб яе цела пахавалі па хрысціянскаму абраду пры царкве ў Казані. Найбольшы клопат і перажыванні выклікала адзіная дачка Марыяна ад першага мужа Юрыя Турлева, якая была яшчэ непаўналетняя на той час. Яна вельмі перажывала за яе лёс і прасіла мужа і апякунаў, каб вызвалілі яе з палону. Шляхцянка пагражала выклікаць на "*страшны Божы суд*" усіх, хто будзе рабіць перашкоды Марыяне. Усю сваю маёмасць яна перадавала дачцэ. Сярод іх – рухомыя рэчы, якія былі пры ёй у палоне: сукенка, шапка, дзве целагрэйкі,

[1] Казімер Шапка Хатольскі і Марцін Станіслаў Валадковіч знаходзіліся ў той час ў палоне, куды патрапілі пасля захопу маскоўцамі Віцебскага замку (1654 г.).

два срэбных ланцугі, падараваныя А.А.Кармоцкім, белыя хусткі і два чырвоных злотых, а таксама 1 000 злотых, якія запісаў ёй першы муж на сваім маёнтку Турлаўшчызна. Лявона Кучука Ганна прасіла паклапаціцца пра дачку, але не пакінула яго апякунам для дачкі. Прычынамі такога рашэння маглі быць наступныя. Другі шлюб на момант напісання тэстаменту быў нядоўгім, яна недастаткова добра ведала мужа, каб магла даверыць яму дзіця. Акрамя гэтага, дачка была ад Юрыя Турлева, яна была для Л.Кучука па сутнасці чужой. Пры гэтым ён на той час быў яшчэ ў палоне і невядома, як мог скаласціся яго далейшы лёс. Ганна Матушэвічоўна прасіла шляхціца Мікалая Іваноўскага і яго жонку ўзяць Марыяну на выхаванне. Апякунамі былі абраны полацкі войскі Тэафіл Дажджбог Храпавіцкі, Мікалай Іваноўскі, Самуэль Чапліца [3, с.339-343][2]. Яна іх вельмі прасіла, каб яны вызвалілі дачку з няволі. У выпадку яе смерці ўся згаданная вышэй маёмасць пераходзіла сваякам. Дакумент падпісалі чатыры асобы: троцкі ваяводзіч Геранім Пац, смаленскі стольнік Ян Астроўскі, Самуэль Свіржэўскі, Ян Чапліца. Яны таксама знаходзіліся ў палоне [4, ф.1732, воп.1, спр.1, арк.192–195]. З іх дакладныя звесткі ёсць пра Гераніма Дамініка Паца, які быў сынам троцкага ваяводы Пятра (?–1642) і Гальшкі Шэмет (?–1652). Ён быў захоплены ва ўласным доме і вывезены ў Маскоўскую дзяржаву, пасля быў вызвалены і памёр па дарозе дадому ў 1668 г. [11, с.116–118]. Гэты тэстамент даволі рэдкі і цікавы сваім зместам і месцам напісання. На жаль, ён не раскрывае асаблівасці штодзённага жыцця ў няволі. Аднак, з яго зразумела, што Г.Кучук сутыкнулася з шэрагам цяжкасцей, якія ёй дапамог пераадолець А.А.Кармоцкі. Шлюб з Л.Кучукам даў ёй адносную стабільнасць і абароненасць. Сам дакумент складзены як гэта патрабавала традыцыя і заканадаўства. У ім ёсць распараджэнні аб душы, целе, маёмасці, апецы. Яго падпісала чатыры сведкі. Хоць па Статуту 1588 г. у ваенных умовах дастакова было два (тры – у мірны час, Статут ВКЛ 1588 г. Раздзел 8, артыкул 4).

Тэстаменты, складзеныя ў палоне, адрозніваюцца ад тэстаментаў, напісаных у іншых умовах. У першую чаргу яны распавядаюць пра абставіны, з-за якіх жанчыны трапілі ў няволю, іх жыццё там. Дакументы ілюструюць, што жанчынам адным было вельмі цяжка знаходзіцца ў складных умовах, калі патрабавалася абарона і падтрымка. Гэта вымушала змяняць асабістае жыццё. Шляхцянкі выходзілі замуж, цяжарылі, спадзяваліся выйсці з палона. Знаходзячыся ў няволі прадстаўніцы шляхецтва працягвалі лічыць сябе грамадзянкамі ВКЛ і дакументы складалі паводле нормаў Статута 1588 г. Верагодней за ўсё, тэстаменты пасля аддавалі на захаванне іншым палонным, якія пазней вярталіся да дому і актыкавалі іх у гродскіх ці земскіх судах. Тэстаменты ў палоне скаладалі і мужчыны, таму дадзеныя жаночыя тэстаменты не з'яўляюцца ўнікальнымі па абставінах напісання. Напрыклад, былі складзены такія дакументы віцебскім стольнікам Дамінікам Храпавіцкім, Грыгорам Мікалаевічам Жабай і інш. [2, с.308–312, 330–331]. З'яўленне тэстаментаў у палоне тлумачыцца палітыкай Маскоўскай дзяржавы адносна жыхароў ВКЛ. З першага году вайны інтэрвенты ажыццяўлялі вываз насельніцтва ў Расію. Палонных ператваралі ў прыгонных, імі актыўна вёўся гандаль. Па Андрусаўскаму перамірыю палонных павінны былі вярнуць на радзіму, аднак, далёка не ўсе вярнуліся, многіх вывезлі ў Сібір [7, с.74–75, 125–127].

Тэстамент Ганны з роду Сокалаў Безвадзіцкай добра ілюструе асабістыя перажыванні ў сувязі з вайной (1666 г.). Яна была "*аслаблена векам, няшчасцямі края… і хваробаю*". Яе муж Васіль Безвадзіцкі ўдзельнічаў у абароне Мсціслаўскага замку (1654 г.), дзе быў пасечаны і забіты ворагам. Сын Ян быў захоплены ў няволю і лёс яго Ганне быў невядомы. У якасці апякунаў маёмасці Бязводзіцы (Мсціслаўскае ваяводства) і паловы яе пасагавай маёмасці Саполава прызначалася дачка Анастасся і яе муж Стэфан Пясляк. Іх апека працягвалася да вяртання сына з палону. Другая палова маёнтка была прызначана дачцэ. Асабістая трагедыя прымусіла аўтарку дакумента вельмі адмоўна паставіцца да ворага. Напрыклад, яна піша: "*вераломны непрыяцель маскаль*" пад кіраўніцтвам князя Трубецкага захапіў Мсціслаўскі замак [3, с.128, 139–140]. Гэтая вайна прынесла ёй вялікія страты –

[2] Самуэль Чапліца разам з жонкай і дзецьмі патрапіў у палон пад час абароны Віцебскага замку ў 1654 г.

амаль уся сям'я была знішчана, шляхецкая сям'я засталася без нашчадка. Таму ў дадзеным выпадку вораг не мог выклікаць ніякіх сімпатый, сваю боль жанчына не змагла схаваць пры напісанні апошняй волі.

Акрамя жанчынаў пра іх лёс маглі распавесці тэстаменты іх сваякоў і бацькоў. Так, Аляксандр Грыгоравіч Варанец пісаў свой тэстамент будучы цяжка параненым пры Мсціслаўскай абароне 1659 г. у замку. Ён быў праваслаўнага веравызнання і прасіў сваіх стрыечных братоў Марціна і Паўла Варанцоў пахаваць яго ў Тупічэўскім манастыры ў Мсціслаўлі. Па дакументу яны з'яўляліся яго асноўнымі спадкаемцамі, бо дзяцей і родных братоў у яго не было, а родная сястра Юдыта "*пры першай аблозе Трубецкім Мсціслаўскага замку (1654 г.) праз меч у палон узята была*". Сяло Асмаловічы (Мсціслаўскае ваяводства) было прызначана Аляксандру і Юдыце ў спадчыну. Сваю частку ён запісаў адразу братам, а частка сястры пераходзіла да іх толькі тады, калі яна не вернецца з палону [3, с.126–192]. Знаходжанне ў палоне не пазбаўляла яе правоў на спадчыну, толькі інфармацыя аб яе смерці прыводзіла да перадачы яе маёмасці іншым. А.Г.Варанец паведаміў у тэстаменце не толькі абставіны напісання дакументу, але і пра лёс сваёй роднай сястры, што было неабходна пры размеркаванні маёмасці.

Шляхціц Полацкага ваяводства Аляксандр Геранімавіч Чаркас (?–1655) адзначаў у сваім тэстаменце: "*его м(и)л(о)сть панъ Крышътофъ Пчыцъкии, тест(ь) мои, без ведомости моеи, взявшы зъ збегув малжонку мою и з цоркою моею Цецылиею, од пана Варпаховского, з Ыфлянтъ, до Вилна звезъ, о которых и до тых час ведомости не маю, где се оборочают*" (1655 г.). Аднак, нягледзячы на тое, што А.Г.Чаркас не меў звестак аб жонцы і дачцэ Цэцыліі, апошняй ён пакінуў выправу ў памеры 600 злотых, а апеку над ёй да паўналецця даручыў родным братам Яну і Юрыю Чаркасам [4, ф.1823, воп.1, спр.1, арк.481–482]. У пачатку вайны бяспечнымі месцамі для пражывання былі Інфлянты, Вільня, таму туды з'язжалі многія шляхцкія сем'і.

Сям'ю Геліяша Сігнітэўскага і Ганны Старасельскай таксама напаткалі няшчасці, аб чым распавядае тэстамент шляхціца (1663 г.). Разам з дзецьмі апынулася ў палоне іх дачка Барбара, жонка Філона Грымалоўскага, там яна і памерла. Старэйшы сын Андрэй загінуў, ваюючы пад началам польнага гетмана ВКЛ Вінцэнта Гансеўскага, а другі сын Томаш на той час служыў у войску ВКЛ. Геліяш меў надзею на яго вяртанне. Сыну прызначалася маёмасць у Ашмянскім павеце Стадольнікі Падбальванішскія. У выпадку яго невяртання бацька аддаваў палову жонцы ў пажыццёвае карыстанне, а палову дзецям другой дачкі Ганны – Алене і Яганне [4, ф.1732, воп.1, спр.1, арк.19–20]. У дадзеным выпадку прадстаўлены трагічны лёс дзвух жанчынаў – маці і дачкі. Г.Старасельская страціла дачку і сына, а ўнукі патрапілі ў палон і што з імі было далей – дакумент не паведамляе. Барбара Грымалоўская не перанесла вайсковых падзеяў і памерла ў палоне. Прычына яе смерці невядомая. Тэстаменты гэтага часу адрозніваюцца фармулярам і зместам. Вайна наклала на іх значны адбітак. Змяніўся пачатковы пратакол, надавалася ўвага абставінам напісання тэстаменту і вайсковым падзеям, адзначаўся лёс родных, негатыўна апісваўся вораг і яго дзеянні.

Часткова лёс жанчынаў асвятляюць скаргі. Тэафілія Макарская скардзілася ў Мсціслаўскі гродскі суд аб страце дакументаў і маёмасці пад час вайны (1666 г.). Дакумент паведамляе, што ў перыяд першай Мсціслаўскай абароны ў 1654 г., як і іншыя прадстаўнікі шляхты, яна разам з мужам Пятром Мянжынскім, узяўшы з сабой дакументы, маёмасць і грошы, хавалася ў замку. У выніку вайсковых дзеянняў загінуў муж, а Т.Макарская і яе дзеці трапілі ў палон. Дакументы на маёмасць Асмаловічы, пазыковыя запісы і іншыя паперы загінулі. У скарзе аўтарка ўзгадвала змест загінуўшых дакументаў [3, с.136–138]. Гэта была не адзіная скарга ў той час. Для пацьверджання дакументаў, правоў на маёнткі падавалі скаргі многія шляхціцы і шляхцянкі. Напрыклад, такі ж змест меў дакумент пададзены шляхціцам Мсціслаўскага ваяводства Філімонам Арлом (1666 г.). Шляхціц Полацкага ваяводства скардзіўся на знішчэнне маёмасці на суму 10 000 злотых (1668 г.) [3, с.150–151, 325]. Гэтыя выпадкі не адзіныя, страты панесла амаль кожная шляхецкая сям'я. Дакументы на маёмасць узнавіць у большасці выпадкаў было немагчыма, бо гарэлі і знішчаліся як

сямейныя, так і павятовыя архівы. Змест дакументаў рэканструяваўся па памяці, таму адразу пасля заканчэння вайсковых дзеянняў шляхта імкнулася зафіксаваць свае страты, правы на маёмасць у мясцовых судах.

Эмоцыі і перажыванні адлюстроўваліся ў дзённіках і мемуарах, якія пісалі сведкі падзеяў. Сярод такіх крыніцаў можна адзначыць успамны Яна Цадроўскага, дзе распавядаецца не толькі пра лёс яго сям'і, але і пра тагачасныя падзеі. Незадоўга да пачатку (1650 г.) ён ажаніўся другі раз на Ганне Мірскай (1628–1660), дачцэ стражніка ВКЛ Грыгора Мірскага і Кацярыны Капашчэўскай. Першая яго жонка Марыяна Швыкоўская памерла 5 мая 1649 г., не пакінуўшы нашчадкаў. Да вайны ў сям'і нарадзілася двое дзяцей: сын Грыгор (12 верасня 1651 г.) і дачка Кацярына (24 кастрычніка 1653 г.). Пры гэтым у Ганны было два выкідышы ў 1652 г. на трэцім і на сёмым месяцах цяжарнасці. З пачаткам вайсковых дзеянняў сям'я Я.Цадроўскага перажыла шмат непрыемнасцяў. Пасля ўзяцця Вільні (8 жніўня 1655 г.) яна вымушана была пераехаць у Жамойць, а калі ў красавіку 1656 г. там пачаліся хваляванні супраць шведаў – вярнулася ў Менскае ваяводства. Я.Цадроўскі быў выпраўлены шляхтай ад Менскага ваяводства з чалабітнаю да маскоўскага цара (1656 г.), пасля ён удзельнічаў у знішчэнні маскоўскай пяхоты ў Камені Харэцкім. З-за пагрозы ён разам з сям'ёй пераехаў з Барысава ў Слуцк да бацькі жонкі. Вайна прынесла шмат стратаў гэтай сям'і. Памерла дачка Кацярына ад воспы (1655 г.). Ганна скінула дачку з-за ліхаманкі і гарачкі (21 сакавіка 1656 г.). Праз год яна нарадзіла сына Станіслава, якога неданасіла некалькі тыдняў. Яго хрысцілі ў гэты ж дзень іа026a125a[illegible]025a7

г.Валожын 1998 г., Ветка 2001 г., Капаткевічы (са сцягам) 2001 г., Карма (са сцягам) 2000 г., г.Кобрын (са сцягам) 2004 г., сцягоў г.Ельск 2001 г., Мар'іна Горка 2000 г., Мсціслаўе 2001 г., Нароўля 2001 г., рэканструкцый гербаў г.Барысаў 1792 г., 2000 г., Гомель (са сцягам 2001 г.) 1856 г., 1997 г., Камянец XVI ст., 1998 г., Лагішын 1569 г., 1999 г., Мазыр 1577 г., 2001 г., Парычы (са сцягам) 1643 г., 2001 г., Хоцімск (са сцягам) 2001 г., сцягоў г.Навагрудак 2001 г., Рагачоў 1781 г., 2001 г., Светлагорск 2000 г., Смалявічы 2000 г., Чачэрск 2001 г.

Сапраўдная, поўная гісторыя стварэння гербаў і сцягоў патрабуе перш за ўсё ўказаць (наколькі гэта магчыма ў дадзеным выпадку) аўтараў створаных і адноўленых гербаў і сцягоў, а таксама мастакоў – усіх тых, хто заслугоўваў словы падзякі, і без чыёй працы дадзеная кніга не ўбачыла б свет. (Гэтыя ж людзі ў асноўным рабілі абгрунтаванні гербаў, якія таксама былі выкарыстаны аўтарамі кнігі). Узгадаем іх: начальнік Дзяржаўнай геральдычнай службы Рэспублікі Беларусь (1992–1997 г.) Вячаслаў Насевіч – аўтар гербаў г.Дуброўна 1996 г., Смалявічы 1998 г., Старыя Дарогі; вядучы спецыяліст Службы (1998–2000 г.) Андрэй Шпунт – аўтар гербаў г.Акцябрскі 1998 г., Гарадзея (са сцягам) 2001 г., Белаазёрск 1998 г., Ельск 2001 г., Жыткавічы 2000 г., Заслаўе 1999 г., Івянец 1998 г., Косава 1998 г., Крупкі 1999 г., Лунінец 1998 г., Маладзечна 2000 г., Мар'іна Горка 2000 г., Мікашэвічы 1998 г., Маларыта 1998 г., Мядзел 2001 г., Узда (са сцягам) 2000 г., Чачэрск 2001 г., рэканструкцый гербаў г.Капыль 1652 г., 2000 г., Клецк 1652 г., 1999 г.; Нясвіж (са сцягам) 1586 г., 2000 г., Радашковічы (са сцягам) 1792 г., 1999 г.; спецыяліст I кат. Службы (з 2000 г.) Марына Елінская – аўтар гербаў г.Добруш (са сцягам) 2001 г., Кіраўск (са сцягам) 2001 г., Лоева (са сцягам) 2001 г., Сасновы Бор (са сцягам) 2001 г., Стрэшын (са сцягам), Тураў (са сцягам) 2002 г., Хойнікі (са сцягам) 2001 г., сцяга г.Барысава; геральдыст Анатоль Цітоў – аўтар герба Глуска, рэканструкцый гербаў г.Высокае 16 ст., 1998 г., Горкі 1867 г., 2001 г., Горадня XVI ст., 1994 г., Малеч 1645 г., 1998 г., Пінск 1581 г., 1994 г., Навабеліцкага р-на г.Гомеля 1781 г., 2002 г., Наваградак 1595 г., 2001 г., Полацк 1580 г., 1994 г., Ружаны 1637 г., 1999 г., Слонім 1591 г., 1998 г., Слуцк 1652 г., 1996 г., Шэрашава 1792 г., 1998 г.; мастак Андрэй Леўчык – аўтар герба г.Дуброўна 1996, Любань 1996 г.; сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзімір Папсуеў – аўтар герба г.Жодзіна 1998 г., Маларыта 1998 г.; А.А.Міхайлаў – аўтар герба г.Старыя Дарогі; мастакі Віктар Ляхар, А.П.Макаўцаў, П.А.Жараў – аўтары герба і сцяга г.Кобрын 2004 г.; сябра Саюза мастакоў Беларусі В.Б.Сушкевіч – аўтар герба і сцяга Ваўкавыска, 2001 г.; рэдактар лунінецкай раённай газеты Таццяна Канапацкая – аўтар герба г.Лунінец 1998 г.; старшыня Ляхавіцкага гарсавета Уладзімір Кузьміч і мастак Сяргей Чарановіч – аўтары герба г.Ляхавічы; старшыня Светлагорскага гарвыканкама Баляслаў Пірштук – аўтар герба г.Светлагорск 2000 г.; сябра Саюза дызайнераў Беларусі Аляксандр Самовіч – аўтар рэканструкцыі герба г.Пружаны 1589 г., 1999 г. Мастакі: М.М.Елінская, А.Леўчык, В.А Ляхар, Інэса Шпунт.

Цалкам лагічна цяпер будзе правесці рэвізію прадстаўленага матэрыялу (усе апісанні гербаў і сцягаў пададзены так як у кнізе, але прыведзены намі ў адпаведнасць з геральдычнымі нормамі, якіх аўтары кнігі не заўсёды прытрымліваліся):

г.ВАЛОЖЫН (Менскай вобласці). Герб: ***у чырвоным полі залатая літара W з чатырма чорнымі палоскамі на кожным згібе.***

Аўтар герба абапіраецца на гіпатэтычных князёў Гальшанскіх, якія, зноў жа гіпатэтычна, карысталіся гербам "*Абданк*" (у чырвоным полі срэбная W). Звернемся да гісторыі горада, у святле стварэння ўладальніцкага герба. Валожын вядомы з XIV ст. Першыя ўладальнікі – Манівіды з 1407 да 1484 г. – заснавалі касцёл. З 1484 г. ім валодаў князь Вярэйскі. У пачатку XVI ст. – А.Гаштольд. З 1542 да 1567 г. Валожын – вялікакняжацкая ўласнасць. З 1567 да 1614 г. горад належаў Радзівілам, а з 1614 да 1713 г. – Служкам, якія заснавалі тут касцёл і кляштар бернардынцаў (ліквідаваны ў 1864 г., пры кляштары дзейнічала школа), пабудавалі драўляную уніяцкую царкву. Кароткі час Валожын быў уласнасцю полацкага ваяводы Дэнгофа. З 1730-х г. да канца XVIII ст. – князёў Чартарыйскіх. Да пачатку XIX ст. горадам паперменна валодалі Радзівілы і Чартарыйскія. З 1803 г. апошнія ўладальнікі – Тышкевічы, заснавалі касцёл Святога Юзафа [1, с.210–211].

Звычайныя крытэрыі пры абранні герба ці яго элемента таго ці іншага ўладальніка-заснавальніка горада для ствараемага праекта гарадскога сімвалу наступныя: заснавальнік-першы ўладальнік; апошні ўладальнік (радзей); род, які валодаў горадам найбольш працяглы тэрмін; адзін з уладальнікаў, дзейнасць якога пакінула станоўчы (ці найбольш станоўчы) след у гісторыі горада. Пры дапамозе гэтых крытэрыяў абранне герба становіцца больш простым, а галоўнае – асэнсаваным, лагічным. У дачыненні да Валожына, з усёй разнастайнасці ўладальнікаў, найбольш верагоднымі кандыдатурамі засталіся: Манівіды, Служкі, Тышкевічы, і магчыма Чартарыйскія.

г.ВАЎКАВЫСК і ВАЎКАВЫСКІ РАЁН (Гарадзенскай вобласці). Герб: ***у блакітным полі срэбны воўк.*** Сцяг: ***палотнішча 1:2, у блакітным полі белы воўк.***

Герб вядомы з XVI ст. Прывілей на магдэбургскае права ад 1503 г. [2, ф.1710, воп.1, спр.32, а.401–403 адв.]. Захаваліся гарадскія пячаткі XVII–XVIII ст. [2, ф.694, воп.4, спр.956, а.423 адв.; спр.2164, а.7], дзе ў полі воўчая галава. На рэканструкцыі А.К.Цітова воўчая галава срэбная [3, с.129]. У 1845 г. воўчая галава намаганнямі Расійскай герольдыі ператвараецца ў воўчую постаць і перамяшчаецца ў другое поле. У 1978 г. герб працягвае пакутны шлях – мясцовыя ўлады запазычваюць другое поле герба 1845 г. і перамяшчаюць яго ў першае, а ў другім полі – палова шасцяронкі (аўтар: Сушкевіч В.Б.). У 1998 г., у сувязі з падрыхтоўкай да зацьвярджэння герба, мясцовае кіраўніцтва горада настойвала на варыянце В.Б.Сушкевіча. Кіраўніцтва Службы, хаця і схільнае да "*кампрамісаў*", адклала разгляд гэтага пытання на тры гады пасля таго, як вядучы спецыяліст аддзела геральдыкі і генеалогіі Дзяржкамархіва А.А.Шпунт падаў на імя С.Я.Рассадзіна дакладную запіску ад 6 снежня 1998 г. па пытанню захавання герба г.Ваўкавыска 1503 г. наступнага зместу: "*Згодна канцэпцыі Дзяржаўнай геральдычнай службы Рэспублікі Беларусь, у дачыненні да герба кожнага горада Беларусі існуе тры магчымых варыянта дзеянняў: 1. пакінуць без змяненняў; 2. даць у новай рэдакцыі; 3. змяніць (стварыць новы). Старажытнейшы айчынны герб горада Ваўкавыска, (...) адносіцца да вялікакняжацкага перыяду, гербы якога могуць падлягаць дзеянню 1-га і часткова 2-га пунктаў. На жаль, неаднаразова Служба пад ціскам знешніх абставінаў (...) вымушана была адыходзіць ад сваіх прынцыпаў. У выпадку з Ваўкавыскам размова ідзе аб прымяненні 3-га пункта, бо выява ваўка замест воўчай галавы не з'яўляецца рэдакцыйнай зменай (...), але відавочна, цудоўнаму, дасканаламу з пункту гледжання геральдыкі, каштоўнаму гістарычнаму помніку – гербу Ваўкавыска не патрэбна ніякая рэдакцыя. У выпадку адхілення герба 1503 г., на маю думку, не мае ніякага значэння што будзе на новым гербе – воўк, ці яго палова, і г.д., бо няма ніякага сэнсу змагацца за нейкія кампрамісы, бо ўсе яны ў рэшце рэшт супярэчаць геральдыцы як гістарычнай навуцы, супярэчаць гістарычнай праўдзе. Задача Службы насуперак усім абставінам – захаванне і выратаванне помнікаў гістарычнай спадчыны (...). Трэба дадаць, што герб 1503 г. існаваў з часоў, калі Вялікае Княства яшчэ не было ў складзе федэрацыі, таму адзіны з галоўных довадаў апанентаў, як было з гербам Кобрына 1589 г., аб "польскім падарунку" адпадае. У выпадку Вашай згоды, гатовы неадкладна падрыхтаваць адпаведныя дакументы*".

г.ВІЛЕЙКА і ВІЛЕЙСКІ РАЁН (Менскай вобласці). Герб: ***у чырвоным полі перавязь у выглядзе срэбнай ракі, па якой плыве судна з цюком тавараў і залатым аржаным коласам пасярэдзіне.***

С.Я.Рассадзін аспрэчвае слушнае сцьвярджэнне А.К.Цітова аб тым, што двухгаловы арол у першых палях гарадскіх гербаў (у дадзеным выпадку Вілейкі) з'яўляўся імперскім, на той падставе, што ў імперскім указе называўся гербам Менска, паколькі меў на грудзях шыльд з гербам губернскага горада. Але не мае значэння, як яго называлі – факт застаецца фактам: перад намі імперскі арол з шыльдам, нібыта трафеем, на якім герб Менска. У 1845 г. месца арла саступае "*Пагоня*", і гэта атрымалася, як сцьвярджае С.Я.Рассадзін, пры больш жорсткім чым кацярынінскі, мікалаеўскім рэжыме (с.35). Але, не звярнуў увагі, на тое, што адбывалася гэта на фоне моцных русіфікатарскіх тэндэнцый, якія яскрава характарызуюць некаторыя "*папраўкі*" у прыватнасці, заўважаная вядомым польскім геральдыстам Стэфанам

Кучыньскім: “*У Пагоні замест падвойнага ягелонскага крыжа – падвойны праваслаўны крыж з касой перакладзінай!*” [4, s.249].

г.ГАНЦАВІЧЫ (Берасцейскай вобласці). Герб: ***у блакітным полі два срэбныя жоравы, у правым вуглу шчыта залатая зорка, пад ёй паўмесяц рагамі ўверх.***

Мясцовыя ўлады так абгрунтавалі свой герб: “*Связь с историческим символом рода Чапских, которые владели населёнными пунктами в районе. В центре два белых журавля – символы полесского края, счастья, миролюбия*” [5, “*Описание герба Ганцевич*”]. Аднак, як вядома, герб Чапскіх – “*Ляліва*”: у блакітным полі залаты паўмесяц рагамі дагары, між якімі залатая шасціканцовая зорка, а белыя жоравы не з’яўляюцца сімваламі палескага края. Фігура сустракаецца рэдка, за выключэннем жорава трымаючага ў лапе камень, пад назвай “*пільны*” [6, p.186], таксама герб “*Тачала*”, што сустракаецца ў Малой Польшчы: у залатым полі шэры жораў з чорнай галавой, з паднятай левай нагой, па баках шыі шасціканцовыя зоркі [7, s.151]. Жыхары Ганцавіч, як сведчыць С.Я.Рассадзін, імкнуліся падкрэсліць “*сувязь з гістарычным сімвалам графаў Чапскіх*”. Але сарамліва адмовіліся ад шасціканцовай зоркі. Разважанні С.Я.Рассадзіна аб тым, што паколькі ў класічнай геральдыцы да так званых натуральных фігураў належаць і пяціканцовыя зоркі, то пяціканцовая зорка мае права на існаванне ў прадстаўленым гербе, не маюць дачынення да “*гістарычнага сімвала графаў Чапскіх*”, паколькі герба “*Ляліва*” з такой адменай не існуе.

г.ГОМЕЛЬ. Герб: ***у блакітным полі ляжыць залатая рысь.*** Сцяг: ***палотнішча 1:2, у блакітным полі ляжыць жоўтая рысь.***

Першы герб быў дараваны Гомелю 21 сакавіка 1560 г. Апісанне з прывілея Жыгімонта Аўгуста “*мещаном Гомейским на печать местьскую*”: пячатка “*з гербом крыжа*” [8, с.160]. Малюнак адсутнічае. На рэканструкцыі А.К.Цітова ў “*чырвоным полі сярэбраны кавалерскі крыж*” [3, с.147]. З прывілея не бачна, якія былі гербавыя колеры. Мабыць, А.К.Цітоў і меў рацыю адносна вышэйпрыведзеных колераў, аднак, не прыводзіць тлумачэнняў. Падобны герб мы сустракаем у польскага горада Жэшава, які ўжываў яго з XV ст.: “*у блакітным полі срэбны кавалерскі крыж*”. Выступае як фрагмент герба “*Шранява*” тагачаснага ўладальніка горада Пятра Кміты. Першапачаткова поле было чырвонае [9, s.192]. Але на час надання герба Гомель быў дзяржаўным уладаннем, таму ніякіх аналогіяў з уладальніцкай сімволікай прывесці немагчыма. Калі звярнуцца да хрысціянскай іканаграфіі, то ўбачым, у прыватнасці на беларускіх іконах з сюжэтамі “*Сашэсце ў пекла*” і “*Уваскрасенне – Сашэсце ў пекла*”, у руцэ Езуса Хрыста двухраговую (ластаўкін хвост) харугву, як сімвал Уваскрасення, са знакам крыжа. На іконах 1678 г. з Праабражэнскай царквы г.Чачэрска і другой паловы XVII–пачатку XVIII ст. з Троіцкай царквы сяла Бездзеж Берасцейскай вобласці – у чырвоным полі залаты кавалерскі крыж [10, іл.49, 52], на іконе XVII ст. (?) з царквы Параскевы сяла Альшаны Берасцейскай вобласці – у срэбным полі залаты кавалерскі крыж [10, іл.60]. Тут, здаецца, можна прасачыць некаторую сувязь з рымскім баявым штандартам – лабарумам (лац. *Labarum*), на якім замест былых вайсковых сімвалаў імператар Канстанцін I змясціў крыж ці хрыстаграму [11, с.128]. Такія ж крыжы аздаблялі чырвоныя баявыя сцягі войскаў Рэчы Паспалітай. Адсутнасць навуковага падыхода дала балюча знаць аб сабе ў сувязі з рэгістрацыяй герба г.Гомеля ў 1997 г. Не зважаючы на ўласную дэкларацыю аб “*старажытным гербе*” замест герба 1560 г**.** Служба зацьвердзіла герб, які быў атрыманы горадам ад расійскіх уладаў у 1856 г.: “*у блакітным полі ляжачая рысь*”. Можна дапускаць, што на той момант ні кіраўніцтва Службы, ні тым больш мясцовыя ўлады, проста не ведалі пра існаванне аднаго з самых старажытных гербаў Беларусі. Падчас працы ў Службе на працягу 1998–2000 г. рэцэнзент неаднаразова беспаспяхова ўздымаў пытанне перад новым кіраўніцтвам на конт выпраўлення ранейшай памылкі адносна герба Гомеля 1560 г. У 2000 г. начальнік Службы ў праграмным артыкуле “*Геральдика Гомельщины: историческое наследие и новые задачи*”, паставіў кропку: “*При воссоздании городской геральдики Гомельщины к рекомендациям специалистов как правило прислушиваются. Хороший пример в этом подан был самим областным центром. Своим городским гербом Гомель располагал уже в 1560-м году, но он неоднократно изменялся.*

Однако популярным (мне как коренному гомельчанину, это тоже хорошо известно) всегда был вариант с изображением рыси. Видимо поэтому, когда в Гомеле приступили к воссозданию своего герба, за основу был взят городской герб 1856-го года. Он восходит, в свою очередь, к утверждённому 16 августа 1781 года для Белицы, которая была тогда уездным центром. В результате интенсивных консультаций с геральдической службой, предложенный Гомельским горисполкомом первоначальный проект удалось усовершенствовать: были удалены украшательские элементы и "наслоения" позднего происхождения, которые лишь утяжеляли герб Гомеля. В результате 7 августа 1997 года в Гербовый матрикул был внесён следующий вариант герба города Гомеля: в голубом поле спокойно лежащая золотая рысь" [12]. У далейшым паследваў яшчэ адзін вялікі артыкул, у абарону расійскіх гербаў для беларускіх гарадоў, дзе перавагам "*спокойно лежащей золотой рыси*" было прысвечана шмат месца, у прыватнасці: "*Итак, укорять в чём-то Герольдмейстерскую контору в данном случае, наверное, не приходится. Во-первых, нашей Белице, а потом и её преемнику в качестве уездного центра, Гомелю, досталась гербовая эмблема, проверенная и прославленная в истории самой России. Во-вторых, и среди гербов так называемого "геральдического" периода, точнее, среди пожалованных Станиславом Августом Понятовским в 1792 г., также имелась эмблема рыси – в гербе литовского города Расейняй* [13, с.115]. *К 1855 г., когда рысь стала также и гомельской, прежний герб этого города (серебряный крест в красном поле), пожалованный ему почти триста лет назад, был гомельчанами, наверное, уже основательно забыт*" [13, с.115]. Дзіўна чуць аб "*забыцці*" ад асобы, якая павінна клапаціцца аб захаванні тых "*забытых*" нацыянальных гербаў.

г.ЕЛЬСК і ЕЛЬСКІ РАЁН (Гомельскай вобласці). Герб: ***У чырвоным полі два перакрыжааныя срэбныя мячы. Сцяг: Палотнішча 1:2, у чырвоным полі два белыя перакрыжаваныя мячы.***

Першапачатковы праект герба прадугледжаваў паміж мячамі залатую шасціканцовую зорку, як адзін з варыянтаў герба "*Пелеш*". Дадзены праект быў зменены С.Я.Рассадзіным без згоды аўтара герба.

г.ЖЛОБІН (Гомельскай вобласці). Герб: ***у блакітным полі срэбная ладдзя з разгорнутым ветразем.*** Сцяг: ***палотнішча 1:2, у блакітным полі белая ладдзя з разгорнутым ветразем.***

Ладдзя паказана ў перспектыве, што супярэчыць геральдычным правілам.

г.ЖОДЗІНА (Менскай вобласці). Герб: ***у чырвоным полі сярэбраная жаночая постаць трымае шыльд з гербам "Трубы".***

Першапачатковая ідэя герба, прапанаваная А.А.Шпунтам, змяшчалася ў наступным: "*у чырвоным полі Найсвяцейшая Дзева Марыя, у падножжа якой шыльд з гербам "Ражкі*". Горад належаў Радзівілам, што адлюстравана ў шыльдзе. Найсвяцейшая Панна Марыя выступае ў якасці патранэсы (можна ўбачыць сувязь з гербам Менска). Аналагічныя гербы, дзе святы патрон прадстаўлены разам з эмблемай ўладальніка, звычайная рэч у еўрапейскай геральдыцы, напрыклад ў гербах Замосця ці Ўроцлава. У моц розных прычынаў, па віне кіраўніцтва Службы, герб быў прыняты ў дадзеным выглядзе. Абстрактная жаночая постаць, згодна тлумачэнням начальніка Службы С.Я.Рассадзіна, павінна асацыявацца з помнікам ганаровай грамадзянцы Жодзіна (1972 г.) Настассі Купрыянавай!

г.ЖЫТКАВІЧЫ (Гомельскай вобласці). Герб: ***у чырвоным полі срэбны хвалісты пас, над ім срэбны герб "Сястрынец": срэбная страла з раздвоеным і перасечаным крыжам дрэўкам.***

Першапачатковы праект герба быў без "*Сястрынца*". Дадзены праект быў зменены С.Я.Рассадзіным без згоды аўтара герба.

г.КАМЯНЕЦ (Берасцейскай вобласці). Герб: ***у блакітным полі на зялёнай горцы чырвоная вежа.***

Захаваліся гарадскія пячаткі з датай "*1583*" на дакумантах XVI–XVIII ст., дзе ў полі вежа-данжон з востракутным дахам [14, с.209]. Вядома таксама перамалёўка гарадской пячаткі першай паловы XVI ст. са збораў М.Гумоўскага, дзе ў полі мур з вежай за ім [3, с.166]. Магчыма, гэта пячатка 1528 г. з вежай і

мурам, якую згадвае Э.Рымша [15, s.256]. На першай рэканструкцыі А.К.Цітова 1989 г. "*у блакітным полі на зялёнай горцы белая вежа-данжон з востракутным дахам*" [16, с.115], на другой рэканструкцыі 1998 г. – "*у сярэбраным полі чырвоны мур з чырвонай вежай за ім*" [3, с.166]. Гербавая выява, паводле сцьвярджэння С.Я.Рассадзіна, была набліжна да "*рэальнага выгляду*" (с.56). Але насуперак базаваму геральдычнаму правілу, што забараняе накладваць эмаль на эмаль.

г.КОБРЫН і КОБРЫНСКІ РАЁН (Берасцейскай вобласці). Герб: ***у блакітным полі Найсвяцейшая Дзева Марыя з Дзіцём, у залатой вольнай частцы св.Ганна.*** Сцяг: ***Палотнішча 1:2, у блакітным полі выява герба.***

Першы герб быў дараваны Кобрыну 10 снежня 1589 г. Апісанне з пацьвярджальнага прывілея 1670 г. Міхала Карыбута Вішнявецкага: "*...образ св.Ганны Samotrzecej (трэцяй у траіх)*" [15, s.318]. На малюнку з пацьвярджальнага прывілея 1662 г. "*у сярэбраным полі святыя Ганна і Марыя з Дзіцём*" [16, с.122]. На рэканструкцыі А.К.Цітова Найсвяцейшая Панна Марыя у чырвоным строі з Немаўлём і св.Ганна ў блакітным строі [3, с.173]. Дзяржаўная геральдычная служба ў 1998 г. падняла пытанне аб вяртанні герба 1589 г. і знайшла падтрымку мясцовых уладаў, але некаторыя прадстаўнікі гарадской грамадзкасці развярнулі актыўную кампанію супрацьдзеяння, з прыцягненнем на свой бок некаторых прадстаўнікоў вышэйшай улады, што ў сваю чаргу паўплывала і на пазіцыю С.Я.Рассадзіна, які разважае наконт адсутнасці эталоннай выявы, пра кампазіцыйныя адрозненні захаваўшыхся пячатак і, нарэшце, пра парушэнні хрысціянскага канона (с.61). Усе гэтыя разважанні не вытрымліваюць крытыкі. Па-першае, як вядома, апісанне герба мае прыярытэт над малюнкам. Па-другое, з апісання нам вядомы сюжэт даволі папулярны ў заходняй іканаграфіі (у прыватнасці да яго звярталіся Альбрэхт Дзюрэр і Леанарда да Вінчы), на падставе якога павінна была быць зроблена рэканструкцыя. І па-трэцяе, некарэктна сцьвярджаць аб "*істотным парушэнні хрысціянскага канона*", паколькі сюжэт не супярэчыць каталіцкай іканаграфіі, а герб у гэтай іканаграфіі і быў створаны. У выніку, Кобрын адмовіўся ад свайго старажытнага герба (каталіцкага), на карысць новага, але кананічнага (праваслаўнага).

г.КЛЕЦК (Менскай вобласці). Герб: ***у залатым полі чорны паляўнічы ражок з залатой фурнітурай, над ім княжацкая карона.***

Згодна сцьвярджэнню С.Кжыжаноўскага, у гербе паляўнічы ражок і княжацкая карона над ім [17, s.15]. На перамалёўцы гарадской пячаткі 1697 г. тая ж выява (ражок павернуты ўлева) [3, с.169]. На рэканструкцыі А.К.Цітова "*у блакітным полі залатая княжацкая карона, пад ёй чорны паляўнічы ражок (павернуты ўправа)*" [3, с.169]. На гарадской пячатцы Клецка 1697 г. са збораў М.Гумоўскага ў Нацыянальным музеі ў Кракаве княжацкая мітра (ці шапка, нарэшце, карона), прадстаўлена без крыжа ўверсе і з гарнастаевым футрам [3, с.169]. Гэта зусім не азначае, што не мог выкарыстоўвацца больш "*эфектны*" варыянт з крыжам і гарнастаем. У падцьвярджэнне можна прывесці мноства прыкладаў. У прыватнасці: вялікая пячатка Багуслава князя Радзівіла [14, с.22], "*Арол з ражкамі*" і "*Арол у клейнодзе*" як элементы поўнага герба Радзівілаў [18, s.195], вялікая 1669 г. і малая таго ж года, пячаткі Міхала Карыбута Вішнявецкага [18, s.143], гарадскія пячаткі Бабра 1735 г. [14, с.195] і Шклова 1762 і 1792 г.[14, с.231] і г.д. Колеры і выгляд паляўнічага ражка як элемента радавога герба Радзівілаў "*Трубы*", безумоўна, ідэнтычны з капыльскім ражком. Адносна колеру поля, ідучы метадам выключэння, можна было застанавіцца толькі на блакітным і золаце. Блакітны – колер поля, у якім "*Трубы*" змяшчаюцца на шыльдзе "*радзівілаўскага*" арла, і залатое поле, у якім прадстаўлены поўны герб Радзівілаў. Блакітны быў выкарыстаны ў рэканструкцыі А.К.Цітова [3, с.74–75]. Але залатое поле мае дадатковыя перавагі. Па-першае, з пункту гледжання геральдыкі як мастацтва, размяшчэнне мітры і ражка ў залатым полі бясспрэчна лепш, і, што самае галоўнае, па-другое, колер поля ў гербе Капыля 1652 г., таксама сведчыць на карысць залатога поля [5, "*Обоснование реконструированного проекта герба города Клецка 1652 г.*", от 18.10.1999 г.].

г.п.ЛАГІШЫН (Пінскага раёна Берасцейскай вобласці). Герб: ***у блакітным полі срэбны воўк на ласіных нагах.***

Апісанне з прывілея 1569 г. Жыгімонта Аўгуста жыхарам мястэчка Лагішын: "*...герб волка на лосих нагах*" [8, с.161]. М.Марчак дае наступнае апісанне: "*Воўк на нагах жорава з паджатым лісім хвастом*" [19, s.85]. На рэканструкцыі А.К.Цітова "*у блакітным полі натуральны воўк на ласіных нагах*" [3, с.181]. Натуральны монстр у рэшце рэшт пераўтварыўся ў срэбнага рашэннем начальніка Дзяржаўнай геральдычнай службы С.Я.Рассадзіна.

г.ЛАГОЙСК (Менскай вобласці). Герб: ***у блакітным полі тры залатыя пагоркі, якія раздзелены лагамі, над імі залаты паўмесяц рагамі ўверх, між якімі залатая зорка*** (герб распрацаваны мясцовымі сіламі, 1998 г.).

Герб "*Ляліва*" уладальнікаў горада Тышкевічаў быў пакладзены ў аснову першапачатковага варыянта герба, прапанаванага А.А.Шпунтам. Выглядае наступным чынам: "*у блакітным полі залаты паўмесяц рагамі дагары, над ім шасціканцовая зорка таго ж металу*". Вядомы некалькі зменаў дадзенага герба: 1. поле чырвонае. 2. з шасціканцовай зоркі выходзіць срэбная страла джалам ўверх. 3. залаты паўмесяц рагамі ўніз [7, s.91]. Пад ціскам мясцовых уладаў зорка ператварылася ў пяціканцовую. Пяціканцовыя зоркі сустракаюцца, праўда, на пячатках некаторых прадстаўнікоў роду Тышкевічаў у другой палове XVI ст., але гэтую акалічнасць можна тлумачыць хутчэй нядбайнасцю разьбяроў. У "*Апісанні*" герба, падрыхтаванага для рэгістрацыі мясцовымі ўладамі, абгрунтаванне "*зменнага*" элемента ўражвае шырынёй размаху: "*Пять лучей звезды символизируют связь, дружбу людей пяти континентов земли*" [5, "*Решение Логойского Райисполкома от 16.06.1998 г. № 18*"].

г.ЛЯХАВІЧЫ (Берасцейскай вобласці). Герб: ***у чырвоным полі план срэбнага Ляхавіцкага замка.***

План замка зроблены адпаведна гравюры XVII ст. Сусветная практыка не ведае падобнага адлюстравання гарадской архітэктуры ў гербах. Замест плана павінен быць паказаны замкавы фасад.

г.МАЗЫР (Гомельскай вобласці). Герб: ***у блакітным полі чорны арол з раскінутымі крыламі а залатой дзюбе, кіпцюрах і чырвоным языку.***

Герб дараваны 28 студзеня 1577 г.: "*у блакітным полі чорны арол з шыльдам з літарай "S*" [2, ф.694, воп.1, спр.161]. Літара "*S*", як каралеўская манаграма, з'яўляецца ганаровай адзнакай. Герб Мазыра, адзіны ў сучасных межах Беларусі, дзе прадстаўлены выдатны ўзор арла з раскінутымі крыламі (*eagle displayed*). Калі прасачыць генэзу гэтай фігуры ў Германіі, то мазырскі герб стане прыкладам успрымання ў той ці іншай ступені беларускай геральдыкай нямецкіх уплываў. Відавочна падабенства з тым, што яўляў сабой "*нямецкі*" арол *displayed* з канца XIV ст.: "*галава выпрамілася, дзюба раскрылася, сталі бачныя кіпцюры*" [6, p.176]. Дадзены герб яўляе сабой цікавы выпадак у нацыянальнай геральдыцы неаднаразовай змены на працягу гістарычнага перыяду аднаго з элементаў. Срэбны шыльд з літарай "*S*" на гербе 1577 г., у 1609 г. быў заменены на празны чырвоны [16, с.28], між 1609 і 1613 г. на пячатцы мазырскай ратушы ў шыльдзе з'яўляецца радзівілаўскі герб "*Ражкі*" [16, с.28–29], які "*пратрымаўся*" у гербе 1577 г. відавочна да III Падзелу Рэчы Паспалітай. Акалічнасць неаднаразовай змены аднаго з галоўных элементаў гэтага герба дазволіла дапусціць А.К.Цітову, што гэты элемент не быў вырашальным [3, с.73]. Дадзенае дапушчэнне патрабуе дапаўнення. Шыльд з каралеўскай манаграмай не быў вырашальным у першую чаргу для тых, хто яго змяняў. У 1796 г. мазырскі герб трапіў пад рэдакцыйныя праўкі Расійскай Герольдыі. Арол пазбавіўся агрэсіўнасці і шыльда. У такім выглядзе ён амаль не стаў адрозніваццa ад герба Нерчынска "*в серебряном поле чёрный летящий одноглавый орёл*" [20, с.100]. У 1999 г. начальнік упраўлення па архітэктуры і горадабудаўніцтву Мазырскага гарвыканкама Н.І.Грачкасей інфармаваў кіраўніцтва Службы: "*Учитывая большое историческое и культурно-воспитательное значение, которое имеет местная символика, а также исходя из традиций и принципов поддержаных нашим*

городом, Мозырский горсовет депутатов утвердил вариант предложенный скульптором Воробьёвым В.П. (...)" [5, "*Ліст начальніка ўпраўлення па архітэктуры і горадабудаўніцтву Мазырскага гарвыканкама Грачкасея Н.І.*"]. Варыянт Вараб'ёва цалкам паўтараў герб 1796 г. У адказ Служба накіравала "*Историко-геральдическое обоснование герба города Мозыря 1577 г.*" (рэканструяванага А.А.Шпунтам), у якім адзначалася, што: "*Поскольку данный вариант герба является наиболее ранним, и вследствие этого представляется наиболее ценным, Государственная геральдическая служба рекомендует Мозырскому горисполкому отдать предпочтение именно ему (...)*" [5, "*Историко-геральдическое обоснование герба города Мозыря 1577 г.*", от 02.07.1999 г.]. Праз некаторы час Служба атрымала з Мазыра пакет дакументаў на зацьвярджэнне герба 1796 г. Супрацоўнікі Службы падрыхтавалі чарговы ліст: "*Очевидно, что из стремления к ложной красивости здесь был введён золотой (жёлтый) контур как вокруг гербового щита, так и вокруг гербовой фигуры (...). Представленная ксерокопия иллюстрации из книги фон Винклера (...) не имеет никакого отношения к гербу г.Мозыря 1577 г. (...) изображение во втором поле является интерпретацией Волкова, (...) поскольку сделано без учёта сохранившегося исторического материала. (...)*" [5, "*Ліст кіраўніцтва Дзяржаўнай геральдычнай службы мазырскім уладам 22.09.1999 г.*"]. Кіраўнік Службы выступіў у друку, але гэта прынесла больш шкоды, бо рабіў акцэнт на якасцях выяў, што па сутнасці справы не мела значэння, чым лішні раз прадэманстраваў свой прафесійны ўзровень: "*Вот и орёл в гербе Мозыря, утверждённом императорским указом 22 января 1796 года вышел каким-то грузным, приземистым… У исполнителя нынешнего варианта, мозырского скульптора В.П.Воробьёва, орёл получился монументальным. Но геральдически более правильным, видимо, будет всё-таки тот вариант, который был разработан специалистами нашей службы. При всём уважении к депутатам Мозырского городского Совета служебный и профессиональный долг заставляет их поправить. Есть правила геральдики и есть ложный – подчёркиваю – патриотизм*" [12]. "*Грузность*", "*приземистость*" ці "*монументальность*", не ўплываюць, асабліва ў дадзеным выпадку, на "*геральдическую правильность*", ды і справа зусім у іншым – проста ў выбары найбольш ранняй выявы, незалежна ад яе якасцяў. Вось такі, "*папраўлены*" герб, пазбаўлены ганаровай адзнакі (якіх у нацыянальнай геральдыцы зусім не шмат) і быў занесены ў Гербавы матрыкул.

в.МАЛЕЧ (Бярозаўскага раёна Берасцейскай вобласці). Герб: ***у срэбным полі паясная выява святога Апостала Пятра з зялёнай пальмай і чорным пэўнем.***

Апісанне з прывілея 1645 г. Уладзіслава IV Вазы: "*Святы Петр з ключамі*" [21, с.341]. Захавалася гарадская пячатка 1792 г., дзе ў полі змешчана паясная профільная выява св.Пятра з малітоўна складзенымі рукамі, на якіх два ключы андрэеўскім крыжом, поруч справа кніга (?), справа раскрыжаванне, пад якім – кветка канюшыны, злева – певень. Пад выявай – перагорнутая трапецыя, у якой лодка з двумя чалавечымі постацямі. Ніжэй надпіс: "*SPETRUS*" [16, с.146]. На рэканструкцыі А.К.Цітова "*у сярэбраным полі паясная выява святога Пятра у чырвона-блакітным строі з малітоўна складзенымі рукамі, на якіх два залатых ключа. Справа зялёная расліна, злева чорны певень*" [3, с.193]. С.Я.Рассадзін шкадуе, што была зацьверджана менавіта рэканструкцыя А.К.Цітова, нібыта, былі яшчэ варыянты. Але як магло быць інакш, калі на запыт малечскага сельскага выканкама, па распараджэнню С.Я.Рассадзіна, на зацьвярджэнне была адпраўлена ксеракопія герба з кнігі А.К.Цітова "*Геральдыка беларускіх местаў*" (Мн., 1998)?

г.МСЦІСЛАЎ і МСЦІСЛАЎСКІ РАЁН (Магілёўскай вобласці). Герб: ***у срэбным полі з блакітнага воблака выходзіць длань Гасподня, узброенная сталёвым мячом, пад ёю – чырвоны воўк, павёрнуты ўлева.***

Першы герб дараваны 16 жніўня 1634 г. Апісанне з прывілея 1634 г. Уладзіслава IV Вазы: "*меч са шчытом на вярху*" [15, s.406]. На гарадской пячатцы на дакуменце 1740 г. у полі шчыт з фэстонамі, з-за якога выходзіць збройная рука з мячом [14, с.219]. На першай рэканструкцыі А.К.Цітова 1989 г. "*у блакітным полі карычневы шчыт з фэстонамі, з-за якога выходзіць сярэбраная збройная рука з мячом таго ж метала*" [16, с.151]. На другой

рэканструкцыі 1998 г. “*у залатым полі сярэбраны шчыт з-за якога выходзіць сярэбраная збройная рука з мячом таго ж метала*” [3, с.200]. Здаецца, можна пагадзіцца з С.Даніленка, які сцьвярджае наступнае: “*У геральдыцы агульнавядома было інтэрпрэтаваць узнятую і арыентаваную ўверх зброю як заклік да помсты. Менавіта ў падобным кантэксце неабходна вытлумачыць герб Мсціслава (...). Па сутнасці мсціслаўскі герб з выявай “мяча помсты” з’яўляўся галосным гербам, які абыгрываў саму назву горада. Ускосным сведчаннем гэтага можа служыць польскамоўная “Крэпасць” XVIII ст., напісаная ў езуіцкіх колах у гонар мсціслаўскага ваяводы Крыштапа Пузыны. У гэтым творы этымалогія гарадской назвы выводзіцца менавіта ад назоўніка “помста*” (А.І.Мальдзіс. На скрыжаванні славянскіх традыцый:Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палавіна XVII–XVIII ст.). Мн., 1980.– С.66–67.) [22, с.21]. “*Меч помсты*” быў атрыманы горадам якраз падчас т.зв. Смаленскай вайны 1632–1634 г., якую вяла Расія з Рэччу Паспалітай. Шчыт на рэканструкцыі 1998 г. нагадвае воблака, што дала падставу С.Я.Рассадзіну сцьвярджаць, наступнае: “*В российской городской геральдике использовались также гербовые эмблемы, весьма схожие с прежней мстиславльской. Конечно, такое сходство удаётся установить, если только исправить ошибку, представленную в обоих изданиях монографии А.К.Титова. То, что им, на основании оттисков городской печати на документах 1740–1767 гг., принимается за щит (то ли коричневый, то ли серебряный, но странно чешуйчатый) – на самом деле, конечно, изображение облака. Следовательно, и выходящая из него рука с мечом – вовсе не “малая Погоня”, а, скорее, сама десница Господня. Как и в гербе Вологды 1780 г.: “В красном поле выходящая из облака рука, держащая золотую державу с серебряным мечем*” [13, с.110]. Увогуле, С.Я.Рассадзін доўга разважае наконт трансфармацый герба Мсціслава, нібыта, іканаграфія герба знаходзіцца пад пытаннем, але не згадвае пра прывілей 1634 г., існаванне якога, усе разважанні наконт сапраўднай выявы робіць безсэнсоўнымі. Па-другое, сюжэты, дзе рука з мячом выходзіць з-за воблака, будзь то герб Волагды 1780 г., ці рэверс срэбнага пфафенфайндталера 1622 г. герцага Браўншвейгскага Хрысціяна [11, с.227] – усе падобныя, воблака там немагчыма прыняць за шчыт, таму дзіўна, што шчыт з клёпкамі і фэстонамі на гарадской пячатцы Мсціслава С.Я.Расадзін прыняў за воблака. У рэшце рэшт атрымалася канструкцыя, якая па словах аўтара: “*пасуе ўсталяванай геральдычнай традыцыі*” (с.84), пры чым апелюе чамусьці да герба Пскова. Але гэта спекуляцыя. “*Пасаваць*” можа ўсё што заўгодна, бо тэарэтычна, любая выява, што трапляе ў гербавае поле, становіцца гербавай.

г.НАВАГРАДАК і НАВАГРАДСКІ РАЁН (Гарадзенскай вобласці). Герб: ***у чырвоным полі св.Архангел Міхаіл у варанёнай зброі з мячом і шалямі на зялёнай выгнутай базе.*** Сцяг: ***палотнішча 1:2, зялёна-чырвонае ў пас, пасярэдзіне герб Наваградка і наваградскага раёна.***

Аўтар сцяга, мае павярхоўнае ўяўленне аб вексілалогіі. Па-першае, згодна іерархіі гербавых колераў, чырвоная паласа павінна быць над зялёнай. Па-другое, у выпадку паласатага сцяга (палосы адлюстроўваюць герб) не бачыцца сэнсу ў змяшчэнні герба. Па-трэцяе, калі ўжо змяшчаць герб, то поле пажадана каб было аднаго колеру.

г.ПІНСК (Берасцейскай вобласці). Герб: ***у чырвоным полі залаты нацягнуты лук са сталёвым наканечнікам управа.***

Апісанне з прывілея 1581 г. Стэфана Баторага: “*...лук з стралою*” [15, s.457]. На ўсіх захаваных пячатках напрамак стралы розны. На ратушнай пячатцы 1594 г. у полі нацягнуты лук са стралой управа [14, с.224], на пячатцы 1670 г. у полі нацягнуты лук са стралой улева [14, с.224], на пячатцы 1781 г. у полі нацягнуты лук са стралой уверх [14, с.225].

г.СЛУЦК (Менскай вобласці). Герб: ***у блакітным полі на зялёнай выгнутай базе срэбны Пегас, пакрыты чырвонай папонай з залатой манаграмай RD пад княжацкай каронай*** (у кнізе хутчэй шляхецкая).

Да апошняга часу ішла палеміка паміж А.К.Цітовым і А.Грыцкевічам наконт сапраўднага герба Слуцка 1652 г. Довады А.К.Цітова на карысць “*Пегаса*” падмацаваны толькі захаванымі гарадскімі пячаткамі з выявай Пегаса (у полі крылаты конь, на гуньцы пад

княжацкай каронай манаграма “*RD*”) [14, с.228–229] супраць замкавых з “*Пагоняй*” [3, с.78–80]. А.Грыцкевіч спасылаецца на прывілей ад 27 жніўня 1650 г. “*Герб даўні княства Слуцкага: “Вершнік у панцыры на белым кані ў чырвоным полі і звычайна называецца Пагоньчыкам з мячом дабытым*” (Baliński M. Starożytna Polska pod względem historycznym, geograficznym i statystycznym opisana.– Warszawa, 1846.– T.3.– S.672.), прывілей быў зацьверджаны соймам Рэчы Паспалітай 24 сакавіка 1653 г. (Volumina legum.– Petersburg, 1859.– T.IV.– S.194), і нарэшце, каралеўская грамата нададзена Слуцку 27 жніўня 1652 г. (Грыцкевич А. Слуцк. Историко-экономический очерк.– Мн., 1970.– С.16) [23, с.109–110]. Э.Рымша згадвае толькі пячаткі з “*Пегасам*”.

г.п.ТУРАЎ (Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці). Герб: ***у блакітным полі лучнік, гатовы выстраліць, павёрнуты ўлева.*** Сцяг: ***палотнішча 1:2, палосы ў пас: блакітная 6/9 шырыні, белая 1/9, чырвоная 2/9.***

Выява лучніка вельмі натуралістычна, што не ўласціва сучаснай геральдыцы. Згодна іерархіі колераў, на месцы блакітнага павінен быць белы, чырвоны ці жоўты колер.

г.п.ШЭРАШАВА (Пружанскага раёна Берасцейскай вобласці). Герб: ***у срэбным полі Архангел Гаўрыіл пад пальмай з лілеяй ў руцэ.***

Замест апісання ў прывілеі 1792 г. даецца спасылка на змешчаны ў ім малюнак, дзе ў блакітным полі ў чырвона-залатым строі архангел Гаўрыіл з лілеяй ў руцэ, злева пальма [24, ф.389, спр.556, а.62 адв.]. На рэканструкцыі А.К.Цітова “*у сярэбраным полі на зялёнай базе ў чырвона-залатым строі архангел Гаўрыіл з лілеяй ў руцэ, злева пальма*” [3, с.253]. Не зразумела, чаму А.К.Цітоў прапануе срэбнае поле. Напрыклад, на малюнку з прывілея 1792 г. Цырыну блакітнае поле герба цалкам ідэнтычна шарашоўскаму і ў рэканструкцыі А.К.Цітова поле таксама блакітнае [3, с.250].

Мы зрабілі кароткі агляд нацыянальнай гарадской геральдыкі менавіта ў той паслядоўнасці, як яна прадстаўлена ў кнізе, спыняючыся амаль каля кожнага герба і сцяга, называючы імя яго аўтара, робячы тое, што абавязаны былі зрабіць С.Я.Рассадзін і А.М.Міхальчанка. Але акрамя ўсяго гэтага, кніга змяшчае іншыя памылкі, на якія неабходна ўказаць.

У шматлікіх выпадках апісанні гербаў зроблены з парушэннем геральдычных нормаў. (Нават улічваючы тую акалічнасць, што ў нас яшчэ не распрацавана адпаведная тэрміналогія і парадак апісання гербаў, так, як гэта робіцца, напрыклад, у Англіі. Мы таксама, па вядомых прычынах, пакідаем за сабой права на памылку, але памятаем, што апісанне герба павінна быць сціслым і дакладным). Прывядзём некаторыя прыклады:

Азарычы. Замест “*шчыт скошаны злева сярэбранай перавяззю*”, трэба “*сярэбраная перавязь злева*”.

Акцябрскі. Замест “*у правым залатым полі рассечанага “іспанскага” шчыта*”, трэба “*рассечаны ў слуп. У правым залатым полі*”.

Берасцейскі раён. Замест “*варажскі” шчыт перасечаны сярэбраным хвалістым пасам*”, трэба “*сярэбраны хвалісты пас*”.

Івянец. Замест “*выява залатога льва*”, трэба “*залаты леў*”.

Калінкавічы. Замест “*іспанскі” шчыт рассечаны сярэбраным завостраным унізе слупам*”, трэба “*сярэбраны слуп, завостраны ўнізе*”.

Кіраўск. Замест “*на зялёнай зямлі стаіць залаты сноп жыта*”, трэба “*на зялёнай базе залаты сноп жыта*”.

Мазыр. Замест “*узлятае чорны арол*”, трэба “*арол з распасцёртымі крыламі*”.

Навагрудак і Навагрудскі раён. Замест “*стаіць на зялёнай зямлі*”, трэба “*на зялёнай выгнутай базе*”.

Нароўля. Замест “*падкова з залатым крыжам над ёй*”, трэба “*падкова плячыма ўніз, на яе версе залаты кавалерскі крыж*”.

Парычы. Замест “*леў з каронай*”, трэба “*каранаваны леў*”.

Тураў. Замест “*выява лучніка*”, трэба “*лучнік, гатовы выстраліць, павёрнуты ўлева*”.

У апісаннях аўтары абавязкова адзначаюць у межах якога шчыта змешчаны герб. Гэта зусім не абавязковае патрабаванне, паколькі, напрыклад, герб вялікакняжацкага перыяду з роўным поспехам можа быць як на барочным шчыце, так і на іспанскім, і гатыцкім. Пераважная большасць гарадскіх гербаў у сучасных нямецкіх, чэскіх, польскіх гербоўніках, змешчана на 4-х кутных шчытах, галоўным чынам іспанскіх, форма якіх максімальна падыходзіць для размяшчэння фігур, і якія ў сваю чаргу стылёва аднолькава падыходзяць для гербаў усіх перыядаў.

Служба ў свой час вырашыла групам гербаў кожнага гістарычнага перыяду прысвоіць адпаведны шчыт. Мы не будзем зараз закранаць слушнасць гэтага рашэння, і ўвогуле пытанне тыпаў і формаў шчытоў для гарадской геральдыкі Беларусі (гэта асобная тэма), а звернем увагу на тое, якія аўтары кнігі даюць назвы прадстаўленым шчытам.

Так, напрыклад, "*барочны*" шчыт для гербаў вялікакняжацкага перыяду праходзіць у кнізе таксама пад назвай "*германскі*". Але "*барочны*" гэта агульнае акрэсленне, паколькі існуе шэраг разнастайных формаў, якія можна аднесці да гэтага тыпу, і якія ў сваю чаргу адносяцца да французскіх, нямецкіх, іспанскіх, і іншых тыпаў шчытоў.

Французскі шчыт, на якім прадстаўлены гербы перыяду Расійскай імперыі (а таксама сучасны герб Мсціслава), аўтары называюць ці "*рускі*", ці толькі "*рускі*". Хаця на самой справе, гэта розныя тыпы шчытоў. Французскі шчыт яўляе сабой прадаўгаваты 4-х кутнік, ніжнія краі якога злёгку закруглены і зыходзяцца пад вуглом [25, с.29], ці вось такое апісанне – квадрат, ці прамавугольнік, блізкі да квадрату, толькі злёгку выцягнуты ў вышыню, з сэрцавідным завастрэннем да нізу [26, с.253–256]. Па сцьвярджэнню аўтараў кнігі "*Familiengeschichte und Wappenkunde*", дэманструючым 193 формы шчытоў найбольш характэрных для Галандыі, Англіі, Францыі, Германіі, Італіі, Іспаніі, Венгрыі, Польшчы і Расіі, французскі шчыт упершыню з'яўляецца ў Іспаніі ў 2-ой палове XV ст., што не дзіўна, бо ў адрозненне ад астатніх краін Еўропы, для якіх характэрна ў той перыяд 3-х кутная форма шчыта, большасць шчытоў, што сустракаюцца ў Іспаніі, маюць у аснове 4-х кутнік, такая форма з'яўляецца тут ужо ў XII ст. [27, s.120]. Закранаючы ў гэтай сувязі назву, трэба заўважыць, што як нам здаецца, падзел тыпаў шчытоў па назвах краін, носіць у некаторай ступені ўмоўны характар. Адзін з галоўных крытэрыяў – адданне перавагі таму ці іншаму тыпу ў пэўнай краіне ў пэўны перыяд часу. Францускі шчыт – найбольш распаўсюджаная форма для гербаў у XVII–XIX ст. [26, с.253–256] У гэтай сувязі, у найбольш вялікай ступені умоўнасць датычыцца так званых "*рускіх*" шчытоў. Мы павінны згадзіцца з катэгарычнай высновай А.Ф.Кайзера і Е.Д.Ліндэра аб тым, што "*руская геральдыка не самастойна (ist nicht autochtchon), а мясцовыя формы шчытоў скапіраваны з еўрапейскіх*" [27, s.120]. Гэтыя ж аўтары прапануюць выяву "*рускага*" шчыта пад 1800 г., тое, ва што ператварыўся французскі шчыт, калі яго звузілі і выцягнулі.

Гербы сучаснага перыяду прадстаўлены на іспанскіх і гатыцкіх шчытах. Іспанскія шчыты аўтары называюць таксама галандскімі, вянгерскімі, варажскімі. Відавочна яны таксама бачылі кніжкуА.Ф.Кайзера і Е.Д.Ліндэра, памылкова вырашыўшы, што калі іспанскі шчыт сустракаецца ў Галандыі, то яго можна назваць галандскім.

Гатыцкія шчыты праходзяць пад назвай варажскіх, але яны іх толькі нагадваюць, паколькі сапраўдны варажскі шчыт адразу пад вуглом пачынае плаўна зыходзіцца да асяродка, дзе павінна быць ніжняя аснова.

Нарэшце, можна было заўважыць, што сцягі прадстаўленыя ў кнізе маюць розныя формы палотнішчаў і спраектаваны з рознымі падыходамі – у адных ідзе раскладка гербавых колераў, у другіх – механічна пераносіцца гербавая эмблема, у трэціх – яшчэ і гербавыя колеры, прычым усе гэтыя адрозненні не звязаны ні з перыядызацыяй, ні з адміністратыўна-тэрытарыяльным падзелам. Справа ў тым, што ў адрозненне ад стварэння герба, дзе аўтар мае параўнальна шырокае поле для творчай дзейнасці, стварэнне сцяга прадугледжвае прытрымлівання пэўнай сістэмы. У 1999 г., калі з ініцыятывы рэцэнзента, пачаліся работы па ўкараненні гарадской вексілялогіі ў нашай краіне, усе гэтыя пытанні былі разгледжаны. Патрэба ў сістэме стварэння сцягоў вынікала з неабходнасці вызначыць годнае месца

беларускай гарадской вексілялогіі як складовай часткі еўрапейскай цывілізацыі, што ў сваю чаргу патрабавала адказу ў прыватнасці на наступныя пытанні: ці павінна адрозніваццa сістэма будавання сцягоў, канфігурацыя і суадносіны палотнішчаў сцягоў у залежнасці ад іерархіі адміністрацыйнай прыналежнасці і ад прыналежнасці герба да пэўнага гістарычнага перыяду ў які ён быў створаны? Ці павінны адрозніваццa сцягі ўвогуле на тэрыторыі Беларусі, ці адрозненні могуць захоўвацца толькі ў межах вобласці? Наўрад ці меліся падставы для пакутлівых намаганняў па стварэнні нейкай сваёй адметнай сістэмы, з прычыны існавання ўсяго багатага вопыту прымянення гарадскіх сцягоў у краінах Еўропы.

У Польшчы, прынамсі ў Люблінскім ваяводстве, існуе даволі простая сістэма: механічнае перанясенне гербавых колераў на сцягі [28]. Усе палосы размешчаны гарызантальна, а калі поле шчыта падзелена ў слуп, ці маецца яшчэ нейкая "*не гарызантальная*" фігура (пас, ці слуп), то і вертыкальна. Канфігурацыя і суадносіны сцягоў паўсюдна аднолькавыя – прамавугольныя палотнішчы 1:2. Няма праблемы адрозненняў. З 18 сцягоў гарадоў і гмінаў Люблінскага вавяводства з жоўта-чырвонымі гарызантальнымі палосамі – 4, з бела-жоўта-блакітнымі – 2, такіх жа, з суадносінамі палосаў 2:1:2 – 2. Такі падыход не здзіўляе, тым больш, што ў Польшчы ўвогуле вельмі шмат аднолькавых гарадскіх гербаў.

Славакі пайшлі па больш складанаму шляху, здаецца, каб пазбегнуць паўтораў. Распрацоўшчык сцяга можа абраць адзін з ніжэйпрадстаўленых варыянтаў дзеянняў:

1. Сцяг змяшчае ў сябе герб (г.зв. гербавы сцяг). Такі прыём можа датычыць ганаровых фігураў.

2. Сцяг змяшчае ў сабе колер поля герба.

3. Сцяг змяшчае ў сабе колер поля і колер галоўнай фігуры, які трансфармуецца ў бардзюр.

4. Галоўная фігура адлюстравана пасярэдніцтвам дзялення палотнішча аналагічна абрысу фігуры (e.g., Славацкі падвойны крыж. Сустракаецца ў гербах шасці гарадоў. У прыватнасці, у гербе горада Зволен: *"У чырвоным полі сярэбраны шасціканцовы крыж"* і сцяг: палотнішча 2:3, падзелена ў слуп і два разы ў пас, 1-е поле чырвонае, 2-е белае, 3-е белае, 4-е чырвонае, 5-е чырвонае, 6-е белае, вонкавы край – ластаўчын хвост. Ці перакрыжаваныя малаткі як сімвал горнай прамысловасці, адлюстраваныя ў гербах больш чым 50 гарадоў – на сцягах у выглядзе Андрэеўскіх крыжоў, дзе колеры сцягоў натуральна залежаць ад гербавых).

5. Сцяг падзелены на палосы згодна іерархіі гербавых колераў. (Колер галоўнай фігуры займае ганаровае месца, колер поля падпарадкаванае).

6. Сцяг падзелены на палосы колераў палёў. (Таксама, згодна іерархіі – колер першага поля дамініруе над колерам другога поля).

7. Сцяг падзелены на палосы колераў фігуры. (Згодна іерархіі, напрыклад, гербавая фігура "*чорны арол а залатых кіпцюрах і дзюбе*", трансфармуецца ў чорна-жоўты сцяг).

8. Колеры параўнальна складаных гербаў – на палосы. Групы палосаў могуць паўтарацца (2, 3 разы).

Адміністрацыйная іерархія населеных пунктаў адлюстравана толькі ў канфігурацыях палотнішчаў і не закранае суадносіны. Для гарадоў – 2:3, ластаўчын хвост; для камунаў – 2:3 падвойны ластаўчын хвост [29, p.309–313].

Заўважым, што ў Славакіі амаль не практыкуецца перанос гербавай выявы на сцяг, што ў асноўным, тлумачыцца меркаваннямі тэхнічнага характару. Выраб сцягоў павінен быць танным, каб кожны грамадзянін горада мог зрабіць сцяг. Разам з тым мясцовая Геральдычная камісія рэкамендавала для распрацоўкі гарадам, якія маюць дастатковыя фінансавыя магчымасці, шэраг розных мадыфікацыяў сцягоў – штандарты, г.зв. доўгія харугвы (long banners) і г.д., у тым ліку, і гербавыя сцягі [5, "*Ліст Здэнка Г.Алексы да Начальніка Дзяржаўнай геральдычнай службы С.Я.Рассадзіна ад 01.12.1999 г.*"]. Але прастата праектавання гербавых сцягоў, абарочваецца звужэннем магчымасцяў іх выкарыстання. Вядомы славацкі спецыяліст у галіне геральдыкі і вексілялогіі спадар Здэнка

Г.Алексы не вітае ўжыванне гербавых сцягоў, падкрэсліваючы, што ніколі раней яны не ўжываліся [5, "*Ліст Здэнка Г.Алексы да Начальніка Дзяржаўнай геральдычнай службы С.Я.Рассадзіна ад 01.12.1999 г.*"].

У Швейцарыі, насупраць, ўсе кантанальныя сцягі маюць гербавыя выявы, узгадаем герб і сцяг Швейцарскай канфедэрацыі.

Першы беларускі гарадскі сцяг Радашковічаў (1999 г.) быў утвораны раскладкай палосаў паводле іерархіі гербавых колераў. У тым жа годзе рэцэнзентам была вызначана канфігурацыя і суадносіны палотнішчаў у залежнасці ад прыналежнасці герба да пэўнага гістарычнага перыяду. Вялікакняжацкі – палотнішча 1:2, вонкавы край – падвойны ластаўчын хвост; перыяд Расійскай імперыі – 1:2, ластаўчын хвост; сучасны – 1:2. Таксама была падрыхтавана пэўная колькасць праектаў сцягоў і гербаў са сцягамі, з улікам існавання ўсёй разнастайнасці гербавых колераў, фігур на палотнішчах і зручнасці іх выкарыстання. У 2000 г., у сувязі са звальненнем рэцэнзента з пасады вядучага спецыяліста Службы, не згоднага з правадзімай палітыкай кіраўніцтва Службы адносна геральдыкі, кіраўніцтва Службы ў сваю чаргу, пастаўленае адзін на адзін з праблемай праектавання сцягоў, і не ў стане яе вырашыць, вымушана было абмежавацца прамавугольнымі палотнішчамі з суадносінамі 1:2 для ўсіх гістарычных перыядаў і аддаць перавагу гербавым сцягам.

Спадзяемся, што калі стане неабходнасць другога выдання кнігі, С.Я.Рассадзін і А.М.Міхальчанка дадуць больш поўную і аб'ектыўную карціну нацыянальнай гарадской геральдыкі, з указаннем усіх тых, хто яе ствараў.

Літаратура і крыніцы:

1. Батвіннік М.Б., Шаблюк В.У. Валожын.// ЭГБ.– Мн.: БелЭн, 1994.– Т.2.– С.210–211.
2. НГАБ у Менску.
3. Цітоў А.К. Геральдыка Беларускіх местаў.– Мн., 1998.
4. Kuczyński S.K. Polskie herby ziemskie. Geneza, treści, funkcje.– Warszawa, 1993.
5. БАДГС у Менску.
6. Fox-Davies A.C. A Complete Guide to Heraldry.– London, 1968.
7. Górzyński S., Kochanowski J. Herby szlachty polskiej.– Warszawa, 1994.
8. Спірыдонаў М. Гербы гарадоў феадальнай Беларусі.// Маладосць.– 1990.– № 12.
9. Plewako A., Wanag J. Herbarz miast polskich.– Warszawa, 1994.
10. Жывапіс Беларусі XII–XVIII стагоддзяў.– Мн., 1980.
11. Фенглер Х., Гироу Г., Унгер В. Словарь нумизмата.– М., 1982.
12. Рассадин С.Е. Геральдика Гомельщины: историческое наследие и новые задачи.// Гомельская правда.– 14.03.2000.
13. Рассадин С. "*Галантный век*" городской геральдики Беларуси.// АіС.– 2001.– № 4.
14. Цітоў А.К. Пячаткі старажытнай Беларусі.– Мн., 1993.
15. Rimša E. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystes miestu antspaudai.– Vilnius, 1999.
16. Цітоў А.К. Гарадская геральдыка Беларусі.– Мн., 1989.
17. Krzyżanowski S. Słownik heraldyczny dla pomocy w poszukiwaniach archeologicznych.– Kraków, 1870.
18. Kojałowicz W. Herbarz rycerstwa W.X.Litewskiego.– Krakow, 1897.
19. Marczak M. Przewodnik po Polesiu.– Brześć nad Bugiem, 1935.
20. Винклер фон П.П. Гербы городов, губерний, областей и посадов Российской империи, внесённые в Полное собрание законов с 1649 по 1900.– СПб., 1899.
21. АВАК.– Вильна, 1870.– Т.III.
22. Даніленка С. Семантыка магдэбургскіх гербаў Магілёва.// Старонкі гісторыі Магілёва. Зборнік навуковых прац удзельнікаў навуковай канферэнцыі "Гісторыя Магілёва: Мінулае і сучаснасць".– Магілёў, 1998.
23. Грыцкевіч А. Яшчэ раз да пытання аб старадаўнім гарадскім гербе Слуцка.// БГЧ.– 1996.– № 1.
24. РДАСА у Маскве.
25. Лакиер А.Б. Русская геральдика.– М., 1990.
26. Похлёбкин В.В. Международная символика и эмблематика (опыт словаря).– М., 1989.
27. Kaiser A.F., Linder E.D. Familiengeschichte und Wappenkunde.– Augsburg, 1994.
28. Materiały do polskiego herbarza samorządowego./ Pod red. H.Sieroki i K.Skupieńskiego.– Lublin, 1995.– Zeszyt 1.
29. Zdenko G.Alexy. Slovak civic flags and banners.// Proceedings of the 22nd International Congress of Genealogical and Heraldic Sciences in Ottawa August 18–23, 1996.– Ottawa, 1998.

Андрэй Шпунт.

ПЫТАННІ, АДКАЗЫ, КАНТАКТЫ, ІНФАРМАЦЫЯ.

Канферэнцыя

11 снежня 2004 г. у Радуні ў памяшканні Дома культуры адбылася навуковая гісторыка-краязнаўчая канферэнцыя "*З гісторыі краю і лёсаў людзей Воранаўшчыны*", арганізаваная Воранаўскім раённым выканаўчым камітэтам, аддзелам археалогіі Інстытута гісторыі АН Рэспублікі Беларусь, кафедрай гісторыі Беларусі Гарадзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, а таксама Гарадзенскім абласным і Воранаўскім раённым аддзяленнем грамадскага аб'яднання "*Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры*". Канферэнцыя была прымеркаваная да 220-х угодкаў з дня нараджэння гісторыка Тэадора Нарбута і 152-х угодкаў з дня народзінаў археолага, антраполага і краязнаўцы Вандаліна Шукевіча.

Удзел у канферэнцыі прынялі гісторыкі з Горадні і Менску. З дакладам на тэму "*Вывучэнне археалагічнай карты Воранаўскага раёна*" выступіў А.Дабрыян (Горадня), пра "*Неаліт і эпоху бронзы Воранаўскага раёна*" расказаў В.Лакіза (Менск). Археалагічны блок канферэнцыі завяршыла выступленне Н.Пачобут на тэму "*З археалагічных фондаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея*". У гістарычна-краязнаўчым блоку прагучалі даклады С.Марозава, С.Занеўскага, І.Соркінай, А.Цішчанкі і інш. Асобна вылучым выступленні, якія былі прысвечаны персаналіям – К.Падчашынскаму (М.Загідуліна), С.Юндзілу (С.Марозава), генералу К.А.Кандратовічу (І.Коўкель), мастаку Я.Траяноўскаму (В.Швед).

У рамках канферэнцыі адбылася паездка на асвячэнне і адкрыццё адроджанай родавай капліцы В.Шукевіча ў Начы.

Аляксей Шаланда, удзельнік канферэнцыі

Спіс скаротаў:

АВАК – Акты, издаваемые комиссиею высочайше утверждённой, для разбора древних актов в Вильне.
АіС – Архівы і справаводства.
АР РНБ – Аддзел рукапісаў Расійскай Нацыянальнай Бібліятэкі.
АЮЗР – Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные археографической комиссией.
БАДГС – Бягучы архіў Дзяржаўнай геральдычнай службы.
БГЧ – Беларускі гістарычны часопіс.
БРК ГДГАМ – Бібліятэка рэдкай кнігі Гарадзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.
ГДГАМ – Гарадзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей.
ИЮМ – Историко-юридические материалы, извлечённые из актовых книг губернии Витебской и Могилёвской, хранящихся в центральном архиве в Витебске.
КП – Кніга паступлення.
НГАБ – Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.
ПКГЭ – Писцовая книга Гродненской экономии.
РДАСА – Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў.
РИБ – Русская историческая библиотека.
ЭГБ – Энцыклапедыя гісторыі Беларусі.
AGAD – Archiwum Główny Akt Dawnych w Warszawie.
L.S. – Locus Sigilli (месца пячаткі).
Rps. – Rękopis.
* – нарадзіўся.
† – памёр.